Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 ЛІПЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 137 (30017)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

БУДНІ І СВЯТЫ МАЛАДОГА АГРАНОМА

МС

АБУТАК НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

6

КАРАТКА

• **Сумесную вытворчасць малагабарытнай тэхнікі BELARUS плануюць арганізаваць на Кубе.**

• У Мінску з пачатку года высаджана больш за 28 тыс. дрэў і 130 тыс. кустоў.

• **ВУП Беларусі ў студзені—чэрвені вырас на два працэнты.**

• Збожжавыя і зернебабовыя культуры ў Беларусі ўбраны амаль на 8 працэнтах плошчаў.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВАРТА АПЕРАТЫЎНА РЭАГАВАЦЬ НА ЎСЕ ВЫКЛІКІ І ГАРАНТАВАНА ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ ДАСТАЎКУ ЭКСПАРТНЫХ ГРУЗАЎ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную стварэнню партовых магутнасцяў. Таксама на парадку дня — праект Указа «Аб рэалізацыі калійных угнаенняў».

Фота БелТА.

«Вайна вайной, але ўсё ў эканоміцы. Як шмат разоў я папярэджваў вас», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што дадзенае пытанне ўжо разглядалася на адпаведнай нарадзе ў студзені. Тады Прэзідэнт адзначаў, што спробы задушыць Беларусь санкцыямі прывялі да парушэння лагістыкі, у выніку прыйшлося шукаць новыя лагістычныя шляхі. Таму асноўнай тэмай той нарады было будаўніцтва беларускіх партоў у Расіі. Аляксандр Лукашэнка адзначаў у студзені, што ўсе пытанні па перавалцы грузаў праз парты Расійскай Федэрацыі на ўзроўні прэзідэнтаў дзвюх краін вырашаны. У студзені пытанне заставалася за малым — грузіць у гэтых партах і гандляваць праз іх. А пасля — працаваць і над стварэннем беларускіх партоў.

Тады, абмяркоўваючы стварэнне партовых магутнасцяў, гаворка ў асноўным ішла аб калійных угнаеннях. «Гэта зразумела, аб'ёмы самыя вялікія. Сёння мы пра тое пагаворым, а таксама закранём пытанне нафтапрадуктаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў студзені былі вызначаны ўсе напрамкі работы, неабходныя рашэнні па іх прынятыя. Прыйшоў час зверыць гадзіннікі і, калі трэба, падкарэкціраваць і ўзгадніць далейшыя дзеянні і планы.

«Абстаноўка і знешнепалітычная кан'юнктура сёння развіваюцца вельмі дынамічна. Але трэба аддаць належнае, беларуская эканоміка працягвае працаваць і знаходзіць новыя магчымасці ў гэтых няпростых умовах, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы павінны аператыўна рэагаваць на ўсе выклікі і гарантавана забяспечваць дастаўку экспартных грузаў пакупнікам. Ключавы момант — хуткасць прыняцця рашэнняў».

У сувязі з апошнім Прэзідэнт акрэсліў шэраг пытанняў. На якой стадыі знаходзіцца стварэнне ўласных магутнасцяў для марскіх перавозак? «Зразумела, мы сышлі не па сваім жаданні з традыцыйных партоў і працуем практычна па перавалцы нашых грузаў, а гэта амаль 20 мільёнаў тон, ва ўсіх партах Расійскай Федэрацыі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. З гэтага вынікае другое пытанне ад Прэзідэнта — ці ёсць канкрэтныя вынікі ў згаданым напрамку? Ён удакладніў, што мае на ўвазе стварэнне ўласных магутнасцяў.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«Вельмі важна правесці аналіз рэзультатыўнасці здачы вуснага экзамену для дзяцей, што паступалі на мэтавую форму падрыхтоўкі. На думку настаўнікаў, якія ўваходзілі ва ўсе прыёмныя камісіі вуснага экзамену, і прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ, гэта вельмі добрая форма кантролю ведаў абітурыентаў. Мяркуем, сёння сістэма адукацыі гатовая разгледзець магчымасць, у першую чаргу для сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, увядзення вуснага экзамену дадаткова да цэнтралізаванага, які здаецца ўсімі выпускнікамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі».

Выпрабавана на сабе

ВЕЧНЫ ВАНДРОЎНІК

Карэспандэнт «Звязды» прайшлася сцяжынкамі Язэпа Драздовіча

«Сцяжынкамі Язэпа Драздовіча» — менавіта так называецца турыстычны маршрут на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна. Яго складае 36-кіламетровае кола з прыпынкамі ў Германавічах, Сталіцы, Лясковае, Лужках, Жуках Ложных. Якое дачыненне гэтыя вёскі маюць да Язэпа Драздовіча? Не ведаеце? Тады запрашаю ў віртуальную вандроўку, якая, спадзяюся, кагосьці натхніць і на рэальную.

СТАР. 5

Ініцыятыва

Лаванда і мята ў класе пад адкрытым небам

Густы, духмяны, мядовы водар зёлак — адметнасць адной з навучальных установаў Гомельшчыны. Навучэнцы і педагогі Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа даглядаюць унікальны ў сваім родзе гадавальнік лекавых, чайных і вострых траў. Іх вопытам цікавяцца не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

ДУХМЯНАЯ ГАСПАДАРКА

Уласны гадавальнік ва ўстанове быў закладзены яшчэ ў 1992 годзе. Пасадкі занялі тэрыторыю навучальнай гаспадаркі. Да справы падышлі адказна: па дапамогу ў падборы раслін звярнуліся да вучоных Цэнтральнага батанічнага сада Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

«ВАРТА АПЕРАТЫЎНА РЭАГАВАЦЬ НА ЎСЕ ВЫКЛІКІ І ГАРАНТАВАНА ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ ДАСТАЎКУ ЭКСПАРТНЫХ ГРУЗАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэцяе пытанне — якія парты задзейнічаныя для перавозкі калійных угнаенняў і нафтапрадуктаў. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці ёсць у сувязі з тым нейкія праблемы. «І ці ў цэлым ёсць у нас разуменне, колькі калію мы можам пераваліць праз парты Расійскай Федэрацыі на прымальных умовах? Таксама мне дакладвалі і аб альтэрнатыўных варыянтах супрацоўніцтва ў Паўночна-Заходнім рэгіёне Расіі. Гэта павінна быць галоўным пытаннем, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Па сутнасці, мы маем два магчымыя варыянты. Кожны са сваімі перавагамі і недахопамі, я маю на ўвазе Мурманск і Прыморск. Неабходна канчаткова вызначыцца, што нам трэба — будаваць тэрмінал, порт або мадэрнізаваць які-небудзь наяўны, і неадкладна пачаць работу».

Фота БелТА.

Удзельнікі нарады таксама абмеркавалі праект указа аб рэалізацыі асобных відаў тавараў на экспарт. Першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў далажыў, што калі за 6 месяцаў мінулага года праз расійскія марскія парты перавезлі 1,5 мільёна тон беларускіх грузаў, то сёлета гэты аб'ём ужо склаў практычна 6 мільёнаў тон — рост 400 працэнтаў. Практычна ўвесь аб'ём (97 працэнтаў) беларускіх грузаў — гэта хімічныя мінеральныя ўгнаенні, нафта і нафтапрадукты. «Вынікі распачатай у красавіку мінулага года работы па арганізацыі перавалкі беларускага калію праз марскія парты паўночнага захаду і поўдня Расіі сёння даюць магчымасць валодаць партовымі магутнасцямі для перавалкі каля 1 мільёна тон прадукцыі ў месяц або 12 мільёнаў тон за год. Удалося дабіцца эканамічна эфектыўных умоў перавалкі ў тэрміналах партоў Санкт-Пецярбурга. У першым паўгоддзі бягучага года праз гэтыя парты адгружана 2,7 мільёна тон калійных угнаенняў», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

Асноўная задача — мінімізаваць выдаткі па лагістыцы

У размове з журналістамі Мікалай Снапкоў адзначыў, што беларускі бок кампенсаваў ўсе тыя партовыя магутнасці, якія страцілі ў сувязі з санкцыйным ціскам. Цяпер мы можам грузіць 12 мільёнаў тон калійных угнаенняў на год. За папярэднія дзесяць гадоў у сярэднім на год вывозілі па 10-12 мільёнаў тон.

Таму сутнасць нарады заключалася не ў тым, каб дасягнуць аб'ёмаў выгрузкі мінеральных угнаенняў на знешнія рынкі, а ў тым, каб адпрацаваць тыя варыянты, якія дадуць магчымасць павысіць эфектыўнасць перагрузкі ўгнаенняў у партах Расійскай Федэрацыі. «Урад далажыў тыя варыянты, што ў нас сёння ёсць. Прэзідэнт паставіў задачу дапрацаваць і выйсці на аптымальныя варыянты, якія дадуць магчымасць мінімізаваць кошт лагістыкі. Мы бачым сітуацыю на рынку. Мы ставім пастаўкі па аб'ёме вышэй, чым кошт. Тым больш вытворчы сабекошт «Беларуськалія» дазваляе гэта. Паводле ацэнак, наша прадпрыемства другое ў свеце па вытворчым сабекошце. І мы можам вытрымліваць канкурэнцыю ў кошце доўгі час. Але пытанне лагістыкі становіцца ключавым для таго, каб эфектыўна рэалізоўваць угнаенні і забяспечваць прыбытковасць «Беларуськалія» і, адпаведна, плацяжы ў бюджэт. Нам патрэбна аптымальная і эфектыўная лагістыка, чым мы плануем займацца. І я думаю, што ў найбліжэйшы час Прэзідэнту ўнясём канчатковыя варыянты ў сярэднетэрміновай перспектыве арганізацыі партовай інфраструктуры для аптымізацыі кошту калійных угнаенняў, — адзначыў Мікалай Снапкоў.

Па яго словах, беларускія калійныя ўгнаенні запатрабаваныя ў свеце. «Ёсць стабільныя пункты апоры перагрузкі, дзе мы разумеем аб'ёмы і дзе мы разумеем кошт, і ёсць зменлівыя пункты апоры, якія канкурыруюць адзін з адным, каб атрымаць наш тавар. На гэтым мы будзем іграць і атрымліваць мінімальныя кошты па перавалцы. Гэта асноўная задача — мы павінны мінімізаваць выдаткі па лагістыцы», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што пасля ўвядзення санкцый лагістыка стала даражэйшая ад двух да пяці разоў, што датычыцца перавалкі. Адпаведна, тое, што датычыцца павялічанага чыгуначнага шляху, — гэта таксама павелічэнне кошту прыкладна ў 2-2,5 раза.

«Выконваючы пастаўленыя задачы, мы сёлета выйдзем на восем мільёнаў тон продажу ўгнаенняў, пры гэтым «Беларуськалій» працуе з прыбыткам, забяспечвае сваю інвестыцыйную праграму за паўгода. Мы сёння другія ў свеце па аб'ёме вытворчасці калійных угнаенняў, напарадзе нас толькі канадская кампанія і пасля нас канадская кампанія. Гэта сведчыць аб тым, што сістэма продажаў выбудавана эфектыўна, нягледзячы на ў разы ўзрослыя выдаткі», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Адказваючы на пытанне, што больш мэтазгодна — будаваць партовую інфраструктуру ці мадэрнізаваць, Мікалай Снапкоў адказаў, што тут могуць быць розныя варыянты, якія яшчэ трэба ўважліва пралічыць. «Мы будзем лічыць не ў моманце, а ёсць такое паняцце «кошт жыццёвага цыкла тавару». Порт — гэта таксама тавар, і жыццёвы цыкл яго вызначаецца 10-15 гадамі. Вядома, мы будзем лічыць на перспектыву жыццёвага цыкла, трэба нам тое ці не трэба, будаваць ці не. Гэта нацыянальны актыў і мець актыў за мяжой — добра ў любым выпадку, калі ён працуе эфектыўна. З іншага боку, нам сёння трэба, каб перавалка была мінімальная па кошце, таму што мы не можам сабе дазволіць закладваць у перавалку яшчэ і інвестыцыйныя выдаткі. Актыў важны, жыццёвы цыкл важны, мінімальная цана важная таксама. Мы канчаткова вызначымся ва ўрадзе і ўнясём Прэзідэнту на разгляд варыянт, які будзе выгадны ў моманце і з пункту гледжання сярэднетэрміновай перспектывы», — растлумачыў першы віцэ-прэм'ер.

Афіцыйна

Непазбежнасць адказнасці за генацыд

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Дакумент накіраваны на забеспячэнне непазбежнасці адказнасці за генацыд, іншыя цяжкія злачынствы і аднаўленне гістарычнай справядлівасці. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Законам прадугледжваецца недапушчальнасць адмовы ў распачынанні крымінальнай справы і спынення вядзення па справе ў адносінах да памерлых асоб, якія ўчынілі не маючыя тэрміну даўнасці злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, уключаючы генацыд, а таксама ваенныя злачынствы.

Прадстаўнікамі названых асоб змогуць выступаць іх блізкія сваякі. Пры гэтым адмова такіх сваякоў ад удзелу ў працэсе не будзе з'яўляцца перашкодай для расследавання справы і судовага разбору.

Вядзенне па дадзенай катэгорыі спраў будзе ажыццяўляцца па агульных правілах з абавязковым удзелам абаронцы. Пры даказанасці віны памерлай асобы прадугледжваецца вынясенне адносна яе абвінавачвага прыгавору без прызначэння пакарання.

Падрабязнасці

АТРАДЫ ДАБРАВОЛЬЦАЎ

У Мінабароны растлумачылі, хто можа ўступіць у народнае апалчэнне і якія задачы яно будзе выконваць

Атрады народнага апалчэння будуць камплектавацца дабравольцамі з ліку ваеннаабавязаных альбо грамадзян, не прызваных на ваенную службу па мабілізацыі. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве абароны Беларусі.

Як вядома, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб народным апалчэнні». Дакумент стварае прававыя асновы для добраахвотнага ўдзелу грамадзян у забеспячэнні ваеннага становішча, уведзенага ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках краіны. Акрамя таго, ствараюцца дадатковыя ўмовы для аказання садзейнічання тэрытарыяльным органам унутраных спраў пры выкананні імі паўнамоцтваў і абароны маёмасці ўсіх формаў уласнасці ад злачынных і іншых замахаў.

Закон з'яўляецца першым прававым актам у сферы дзейнасці народнага апалчэння ў Беларусі. Атрады народнага апалчэння будуць камплектавацца дабравольцамі з ліку ваеннаабавязаных альбо грамадзян, не прызваных на ваенную службу па мабілізацыі. Дабравольцы павінны быць здольныя па асабістых якасцях і стане здароўя выконваць задачы, якія прадугледжаны законам.

Матэрыяльнае забеспячэнне народнага апалчэння ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных і фізічных асоб і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам. Колькасць атрадаў народнага апалчэння будуць вызначаць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама мясцовыя саветы абароны. Пры гэтым будуць улічвацца наяўнасць дабравольцаў і задачы, што вырашаюцца.

З адменай ваеннага становішча або на аснове Указа Прэзідэнта Беларусі атрады народнага апалчэння расфарміроўваюцца. Залічэнне грамадзяніна дабравольцам у народнае апалчэнне не з'яўляецца падставай для вызвалення ад прызыву на ваенную службу па мабілізацыі і спынення працоўных адносін. Наймальнік абавязаны вызваляць супрацоўніка ад работы для ўдзелу ў народным апалчэнні. Пры вызваленні ад работы за супрацоўнікам захоўваецца месца работы, а таксама сярэдні заработак па месцы.

Атрады народнага апалчэння дыслацыруюцца ў межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, у якой былі сфарміраваны. Размяшчацца дабравольцы будуць па месцы жыхарства. Ваеннае ведамства забяспечвае атрады народнага апалчэння зброяй і боепрыпасамі да яе на наменклатурах Узброеных Сіл, вызначае парадак іх выдачы і ўліку.

Разам з тым існуюць абмежаванні пры залічэнні ў народнае апалчэнне. Адмова мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, мясцовага савета абароны ў залічэнні грамадзяніна ў народнае апалчэнне абскарджанню не падлягае. Як адзначылі ў Мінабароны, у народнае апалчэнне не могуць быць залічаны грамадзяне, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін або пажыццёвага пазбаўлення волі. Туды не могуць уступіць асобы, у адносінах да якіх прыменена мера стрымлівання ў выглядзе ўзяцця пад варту або дамашняга арышту, альбо прынята рашэнне аб інтэрніраванні.

У народнае апалчэнне не могуць быць залічаны грамадзяне, прызнаныя ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі, а таксама тыя, хто мае захворванні або фізічныя недахопы, пры наяўнасці якіх проціпаказанае валоданне зброяй.

Узровень

Эканоміка працуе з плюсам

Беларуская эканоміка аднавілася і выйшла на дадатныя тэмпы росту. Аб гэтым заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Картун, каментуючы вынікі работы эканомікі ў студзені—маі, перадае БелТА.

«Можна канстатаваць, што эканоміка аднавілася і выйшла на дадатныя тэмпы росту — 100,9 працэнта. Больш за 85 працэнтаў усіх галін ужо ў дадатнай зоне. Асноўныя драйверы — прамысловасць і сельская гаспадарка, — сказаў Андрэй Картун. — Дабаўляе вялікімі тэмпамі лёгкая і харчовая прамысловасць, нафтаперапрацоўка. Вытворчасць будматэрыялаў выходзіць у дадатную зону».

Таксама, паводле яго слоў, з кожным месяцам паскараюцца тэмпы росту рознічнага і аптовага тавараабароту. У прыватнасці, рознічны тавараабарот у студзені—маі вырас на 2,9 працэнта, аптовы — на 3,4 працэнта. «Гэта так званыя індыкатары аднаўлення спажывецкай актыўнасці», — звярнуў увагу намеснік міністра.

Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва за чатыры месяцы павялічыліся на 1,6 працэнта і прадаўжаюць расці. Таксама Андрэй Картун адзначыў, што працягваюць запавольвацца інфляцыйныя працэсы. У маі зафіксаваны гістарычны мінімум гадавой інфляцыі — 3,7 працэнта. «Такіх тэмпаў яшчэ не было. Нават па аператыўных даных мы бачым, што яна і далей прадаўжае запавольвацца. У чэрвені чакаем яшчэ меншую», — паведаміў ён.

Тэмпы росту экспарту застаюцца высокімі, за чатыры месяцы — амаль 110 працэнтаў. Забяспечана дадатнае сальда знешняга гандлю. Акрамя таго, намеснік міністра адзначыў дадатную дынаміку з інвестыцыямі.

«Ёсць усе перадумовы для далейшага паспяховага развіцця і абгрунтаванай пазітыўнай ацэнкі вынікаў па паўгоддзі», — рэзюмаваў намеснік кіраўніка эканамічнага ведамства.

Фінансы

Узмоцнена абарона інтарэсаў спажыўцоў банкаўскіх паслуг

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях банкаўскай дзейнасці». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Законам унесены змяненні ў Банкаўскі кодэкс Беларусі ў мэтах удасканалення прававога рэгулявання банкаўскіх адносін з улікам дзеючага заканадаўства, правапрымяняльнай практыкі і міжнароднага вопыту. Так, умацоўваецца статус Нацыянальнага банка як дзяржаўнага органа, адказнага за забеспячэнне фінансавай стабільнасці ў банкаўскай і іншых рэгуляваных ім сферах, павышаецца ўзровень прававой абароны спажыўцоў банкаўскіх паслуг, выключаецца празмерная фінансавая нагрузка на крэдытаатрымальнікаў.

Прыняты меры для пераходу банкаў да міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці ў якасці першачарговых і адзіных стандартаў пры арганізацыі вядзення бухгалтарскага ўліку і фарміраванні фінансавай справаздачнасці.

Законам прадугледжана пашырэнне мэт (арыенціраў) дзейнасці Нацыянальнага банка: акрамя падтрымання цанавой стабільнасці, Нацыянальны банк у якасці асноўнай мэты дзейнасці будзе забяспечваць фінансавую стабільнасць. У Банкаўскім кодэксе таксама замацавана норма аб тым, што Нацыянальны банк садзейнічае ўстойліваму эканамічнаму развіццю краіны.

«Для павышэння ўзроўню прававой абароны спажыўцоў банкаўскіх паслуг уведзена забарона на ўстанаўленне ў крэдытных дагаворах умоў аб выплаце працэнтаў у павышаным памеры ў выпадку невяртання (непагашэння) крэдытаатрымальнікам крэдыту ў тэрмін, абмежаваны памеры штрафаў і няўстоек, што выплачваюцца ў сувязі з невыкананнем або неналежным выкананнем абавязацельстваў па крэдытным дагаворы. Таксама ўстаноўлены пералік выпадкаў, пры якіх банк мае права патрабаваць ад крэдытаатрымальніка датэрміновага вяртання крэдыту. Да іх аднесены падставы, якія аб'ектыўна ствараюць значныя рызыкі невяртання крэдыту», — адзначылі ў прэс-службе.

Законам прадугледжана ўстанаўленне кваліфікацыйных патрабаванняў і патрабаванняў да дзелавой рэпутацыі для службовых асоб, якія выконваюць ключавыя функцыі ў банку. Замацаванне дадзенай нормы ў Банкаўскім кодэксе дасць магчымасць забяспечыць фарміраванне эфектыўнага карпаратыўнага кіравання ў банках.

Закон змяшчае і іншыя палажэнні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці прававога рэгулявання банкаўскіх адносін.

Па палічках

Ільготы, паведамленні і разлікі

Як выплачваць маёмасныя падаткі?

Штогод фізічныя асобы, да якіх адносяцца ў тым ліку грамадзяне Беларусі, выплачваюць тры віды маёмасных падаткаў — зямельны і транспартны падатак і падатак на нерухомую маёмасць. Усе яны выплачваюцца не пазней за 15 лістапада. Сёлета фізічныя асобы даплачваюць падатак на нерухомасць і зямельны падатак за 2022 год, паколькі летась яны ўносілі авансавы плацеж у памеры 50 працэнтаў, а транспартны падатак выплачваецца цалкам за ўвесь мінулы год. Аб ільготах, паведамленнях і вылічэнні маёмасных падаткаў БелТА расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.

СТАЎКА З МІНУСАМ

Асноўныя льготы, якія даюцца фізічным асобам па падатку на нерухомую маёмасць і зямельным падатку, — вызваленне шматдзетных сем'яў ад выплаты падаткаў на ўсе аб'екты нерухомай маёмасці, гэта значыць кватэры, жылыя дамы, гаражы, дачы, садовыя домікі, зямельныя ўчасткі. Акрамя таго, з 2022-га адменена льгота па адной кватэры. З мінулага года фізічныя асобы, якія валодаюць нават адной кватэрай, павінны выплачваць падатак на нерухомасць. Адзіная буйная льгота даецца асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (мужчыны — 63 гады, жанчыны — 58 гадоў), або інвалідам 1—2-й груп. Для такіх асоб прадугледжана вызваленне ад падатку на нерухомасць адносна адной кватэры, якая належыць ім на праве ўласнасці або атрымана ў спадчыну, а таксама аднаго жылога дома. Пры гэтым ільгота даецца незалежна ад таго, што ў гэтых памяшканнях могуць быць зарэгістраваны працаздольныя члены сям'і або іншыя асобы. «Такім чынам, калі ў пенсіянера ва ўласнасці ёсць адна кватэра і адзін жылы дом, то ён не плаціць падатак на нерухомую маёмасць. Падатак неабходна выплачваць толькі ў выпадку, калі ў пенсіянера па ўзросце ёсць, напрыклад, дзве кватэры — адна кватэра льгаціруецца, а другая абкладаецца падаткам. Пры гэтым у падатковым заканадаўстве прапісана, што ў дадзеным выпадку ад падатку на нерухомасць вызваляецца тая кватэра, кошт якой вышэйшы. Гэта значыць, першапачаткова Падатковы кодэкс кажа аб тым, што льгаціруецца аб'ект, па якім сума падатку большая», — распавёў Андрэй Кавалеўскі.

Што датычыцца льгот па транспартным падатку, то тут крыху іншы парадак давання льгот. Стаўка падатку паніжаецца на 50 працэнтаў, калі транспартны сродак зарэгістраваны ў органах ДАІ на пенсіянера па ўзросце, інваліда 1—2-й груп, аднаго з бацькоў у шматдзетнай сям'і. Але ёсць адна важная ўмова: у такой асобы павінна быць сапраўднае вадзіцельскае пасведчанне адпаведнай катэгорыі. Для інвалідаў 3-й групы стаўка транспартнага падатку паніжаецца на 25 працэнтаў пры той жа ўмове. Акрамя таго, ад выплаты транспартнага падатку вызваляюцца электрамабілі з выключна электрычным рухавіком. Таксама ад падатку вызваляюцца транспартныя сродкі, выпушчаныя да 1992 года.

АДКУЛЬ БЯРЭЦЦА СУМА?

У Падатковым кодэксе прадугледжаны парадак вылічэння зямельнага падатку, падатку на нерухомую маёмасць і транспартнага падатку. Напрыклад, для падатку на нерухомасць устаноўлены разліковы кошт тыпавога аб'екта нерухомасці. Ён дыферэнцыраваны па відах аб'екта і па тэрыторыях, на якіх размешчаны аб'ект. Пасля таго плошча памнажаецца на разліковы кошт і прымяняецца адпаведная стаўка падатку. «Напрыклад, возьмем аднапакаёвую кватэру плошчай 60 кв. м у Мінску. Сума падатку па ёй складае каля Br48 за год. Улічваючы, што летась аплачваўся аванс, то падлягае аплаце каля Br25 падатку на нерухомую маёмасць», — растлумачыў Андрэй Кавалеўскі.

Зямельны падатак разлічваецца зыходзячы з кадастравага кошту зямельнага ўчастка і стаўкі падатку. Па транспартных сродках крыху іншы парадак. У Падатковым кодэксе яны разведзены па катэгорыях: легкавыя, грузавыя, матацыклы і гэтак далей. Стаўкі прымяняюцца ў залежнасці ад дазволенай максімальнай масы такога транспартнага сродку або колькасці пасадачных месцаў для аўтобусаў. Асноўная стаўка транспартнага падатку для самай буйной катэгорыі транспартных сродкаў — легкавых аўтамабіляў масай ад 1,75 да 2 тон — складае Br102 за год.

«Пры гэтым зямельны падатак, падатак на нерухомасць і транспартны падатак вылічаюцца падатковым органам зыходзячы з часу фактычнага валодання. Гэта значыць, калі транспартны сродак знаходзіўся на ўліку ў органах ДАІ тры месяцы, то падатак разлічваецца толькі за тры месяцы. Гадавая стаўка размяркоўваецца прапарцыянальна перыяду валодання транспартным сродкам», — распавёў начальнік упраўлення.

МОЖНА І ЧАСТКАМІ

Заканадаўствам прадугледжана, што падатковыя органы накіроўваюць фізічным асобам паведамленні на выплату маёмасных падаткаў. «З мінулага года ўсе падаткі ўжо зведзены да адзінага паведамлення. У адным паведамленні сабраны ўсе аб'екты падаткаабкладання па ўсёй краіне, якія належаць канкрэтнай фізічнай асобе. Гэта вельмі зручна, калі чалавек атрымлівае аднаразовае паведамленне, дзе пазначаны ўсе аб'екты і прыведзены разлік падатку. Можна загадзя спланаваць свае ўласныя сродкі для выплаты падатку», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Выплаціць падаткі можна датэрмінова ці часткамі. Галоўнае, каб уся сума паступіла ў бюджэт не пазней за 15 лістапада. Тым, у каго адкрыты асабісты кабінет на партале падатковых органаў, паведамленні накіроўваюцца туды. Поштай паведамленні накіроўваюцца тым, хто не карыстаецца парталам. Тэрмін накіравання паведамлення — да 1 верасня.

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ПАВЕДАМЛЕННЕ НЕ ПРЫЙШЛО?

Фізасоба можа зарэгістраваць асабісты кабінет на партале падатковых органаў. Там створаны функцыянал, які дазволіць у любы момант нанава сфарміраваць апавяшчэнне і азнаёміцца з ім. У ім указаны QR-код для хуткай аплаты, а таксама УНП, які спатрэбіцца для аплаты з дапамогай АРІП. Акрамя таго, заўсёды можна звярнуцца ў падатковы орган і атрымаць копію такога паведамлення. «На крайні выпадак на сайце падатковых органаў створаны спецыяльны электронны сэрвіс, які дае магчымасць, увёўшы ідэнтыфікацыйны нумар, удакладніць інфармацыю аб сваім уліковым нумары (УНП) і па ім смела правесці плацеж у бюджэт», — параіў Андрэй Кавалеўскі.

АРІП, ІНФАКІЁСКІ І МАБІЛЬНЫЯ ДАДАТКІ

Самы асноўны спосаб — з дапамогай адзінай разліковай інфармацыйнай прасторы (АРІП). Гэта могуць быць інфакіёскі, мабільныя дадаткі альбо інтэрнэт-версіі банкаўскіх дадаткаў. У меню неабходна выбраць «Падаткі», увесці ўліковы нумар плацельшчыка, які змяшчаецца ў паведамленні, і правесці аплату. Падаткі можна выплаціць таксама ў аддзяленнях банкаў або паштовай сувязі наяўнымі або з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты мяркуюць, што да 2050 года Індыя стане другой эканомікай свету

Індыя стане да 2030 года трэцяй, а да 2050-га — другой па памеры эканомікай свету. Аб гэтым заявіў індыйскі мільярдэр Гаўтам Адані на гадавым сходзе акцыянераў Adani Enterprises, флагманскай кампаніі яго кангламерату Adani Group, дзе ён таксама ўзначальвае савет дырэктараў. Яго словы прыводзяць Financial Times і Livemint. Як лічыць Адані, сярэднедушавы даход у краіне ўзрасце больш чым у восем разоў — да $16 тысяч. «Я чакаю, што ў наступнае дзесяцігоддзе Індыя пачне нарошчваць [ВУП] на $1 трлн кожныя 18 месяцаў», — сказаў бізнесмен. Да 2050 года памер эканомікі краіны можа дасягнуць $25-30 трлн, а агульная капіталізацыя рынку акцый перавысіць $40 трлн, мяркуе Адані. Нядаўна аналітыкі Goldman Sachs спрагназавалі, што эканоміка Індыі выйдзе на другое месца ў свеце да 2075-га, саступіўшы толькі Кітаю. Цяпер Індыя займае пятае месца ў свеце па аб'ёме ВУП.

У некалькіх краінах Еўропы ўспыхнулі прыродныя пажары з-за анамальнай спёкі

У Грэцыі, Швейцарыі і Іспаніі ўспыхнулі прыродныя пажары, улады эвакуіруюць жыхароў і турыстаў. Так, паводле звестак грэчаскай газеты «Кацімерыні», паблізу Афінаў пачаліся тры лясныя пажары. Узгаранні пачаліся на фоне высокай тэмпературы — у цэнтральнай частцы краіны яна дасягае 44 градусы па Цэльсію. Пажарныя робяць намаганні па лакалізацыі ўзгаранняў, аднак моцныя вятры перашкаджаюць барацьбе з агнём. Пажарныя Швейцарыі змагаліся з пажарам у кантоне Вале. Паводле даных заходніх СМІ, паліцыя эвакуіруе жыхароў горных вёсак. Каля 200 пажарных, вайскоўцаў, паліцэйскіх, прадстаўнікоў іншых службаў і валанцёраў узяло ўдзел у лакалізацыі ўзгаранняў. У швейцарскай паліцыі паведамілі, што пажар рухаецца ў бок італьянскай граніцы. The Guardian піша, што з-за анамальна высокіх тэмператур пажары могуць успыхнуць на Сіцыліі і Сардзініі. У сталіцы Італіі, паводле апошняй інфармацыі, таксама тэмпературныя рэкорды. Лясныя пажары працягваюцца і ў Іспаніі.

Bild: кіраўнік МЗС Германіі штодня выдаткоўвае каля 9 тысяч еўра на паслугі стыліста

Кіраўнік МЗС ФРГ Аналена Бербак выдаткавала на паслугі стыліста за мінулы год каля 136,5 тысячы еўра. Яна плаціла спецыялісту фіксаваную стаўку ў памеры € 8925 за дзень. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету Bild.

Паводле яе інфармацыі, апроч леташняй статыстыкі, за першую палову 2023-га выдаткі кабінета міністраў Германіі на паслугі цырульнікаў, візажыстаў, касметолагаў і фатографаў, якія ўскладаліся на падаткаплацельшчыкаў, склалі каля паўмільёна еўра. Як лічыць Крысціян Хілгрубер, чые словы прыводзіць газета, падобныя выдаткі федэральнага ўрада з'яўляюцца «сумнеўнымі з юрыдычнага пункту гледжання» і «палітычна пачварнымі». Ён параіў ураду Германіі «аддаваць менш увагі вонкавым праявам у сваіх сувязях з грамадскасцю і больш — форме і зместу сваіх паведамленняў».

Лаванда і мята ў класе пад адкрытым небам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзякуючы спецыялістам удалося правільна падабраць расліны і арганізаваць іх догляд, што дало добрыя вынікі. Сёння на плошчы меншай за гектар тут сабрана ўнікальная калекцыя раслін. Яна налічвае звыш сямідзесяці найменняў лекавых, амаль два дзясяткі — чайных і дзясятак — вострых раслін. Вырошчваюць лімоннік кітайскі, радыёлу руковую, аксаміт амурскі, мацярдушку, лакрычны корань голы, ісоп лекавы, некалькі відаў актынідыі, свідзіны, мяту, шалфей, лаванду і іншыя расліны.

— Ідэя стварэння гадавальніка належала намесніку дырэктара Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа Ларысе Канцавой. Цяпер мы працягваем гэтую традыцыю. Духмяная гаспадарка стала неад'емнай часткай і візітоўкай нашай установы адукацыі, — звяртае ўвагу **намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа Алена КАНАНКОВА.**

Увогуле ў каледжы рыхтуюць слесараў па рамонце сельскагаспадарчых машын і абсталявання, трактарыстаў-машыністаў сельскагаспадарчай вытворчасці, кіроўцаў і кухараў. Да работы ў гадавальніку далучаюцца навучэнцы ўсіх спецыяльнасцяў.

— Для кожнага такая работа карысная, бо пашырае прафесійныя ўменні і навыкі. Для навучэнцаў па спецыяльнасцях сельскагаспадарчай накіраванасці гэта дадатковыя веды па апрацоўцы глебы і вырошчванні разнастайных культур, а для будучых кухараў — магчымасць пашырыць свае веды ў выкарыстанні духмяных траў падчас гатавання ежы і напіткаў, — дадае Алена Кананкова. — Увогуле для пашырэння работ у гадавальніку быў перааснашчаны машынна-трактарны парк каледжа, асвоены вопыт вырошчвання асобных відаў раслін у прамысловых маштабах, вывучаны перспектывы продажу вырашчанай прадукцыі. Падчас заняткаў навучэнцы прымяняюць на практыцы атрыманыя прафесійныя навыкі. Напрыклад, будучыя трактарысты і кіроўцы на сельскагаспадарчых машынах, якімі аснашчаны аўтапарк, апрацоўваюць глебу, вывозяць грузы.

Усе работы ў гадавальніку юнакі і дзяўчаты выконваюць пад кіраўніцтвам майстра вытворчага навучання Святланы Васільчанкі.

— Пачынаем задоўга да таго, як расліны прачнуцца пасля зімы. Трэба скласці план, што і дзе будзе расці ў бягучым годзе, адабраць насенне, падрыхтаванае з мінулага года, вырасціць, калі трэба, расаду, пасадзіць новыя расліны, — тлумачыць **майстар вытворчага навучання Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа Святлана ВАСІЛЬЧАНКА.**

ФІРМЕННЫЯ ЧАІ АД НАВУЧЭНЦАЎ

Для выканання ўсяго комплексу агратэхнічных работ у каледжы ствараюць студэнцкія сельскагаспадарчыя атрады. Штогод у іх складзе працуе каля 40 навучэнцаў першых і другіх курсаў. Займаюцца праполкай, перасадкай раслін, зрэзкай надземнай іх часткі, зборам кветак і лісця, сушкай і пакаваннем высушанай сыравіны. Цяпер у каледжы якраз самая гарачая пара для збору духмянага ўраджаю.

— З вясны пачынаем нарыхтоўваць бадан. Гэту расліну многія любяць выкарыстоўваць для аздаблення клумбаў, але не ўсе ведаюць, што яна цэнная ў лекавых напітках. Ужо скончылі збор ліпавага цвету, бо ў гадавальніку ў нас ёсць і дрэвы. Цяпер вось нарыхтоўваем мяту, лаванду, шалфей, лафант, — дадае Святлана Васільчанка.

Чайныя і частка лекавых раслін становяцца інгрэдыентамі для фірменных чаёў, якімі Жлобінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж славіцца ў раёне. Так, пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў Батанічнага сада НАН Беларусі для гэтага кірунку дзейнасці навучальнай установы распрацаваны рэцэптуры некалькіх відаў напіткаў.

З 2012 года ў каледжы ўвасабляюць у жыццё маладзёжны праект «У зямлі — наша сіла, у зямлі — нашы карані». Лекавыя расліны ў гадавальніку пры неабходнасці вырошчваюць практычна ў прамысловых маштабах. Штогод аб'ём нарыхтаванай прадукцыі ў гадавальніку складае каля 600 кілаграмаў сыравіны ў сухім выглядзе. Вырашчаныя зёлкі пастаўляюцца фармацэўтычным

прадпрыемствам. Ураджай траў штогод даследуецца на адпаведнасць санітарным нормам супрацоўнікамі Жлобінскага раённага Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

— Высокая якасць высушанай сыравіны дазваляе паспяхова рэалізоўваць атрыманую прадукцыю ў тым ліку на кірмашах і выставах, розных мерапрыемствах, а таксама ў кафетэрыі ўстановы. Натуральныя чаі — брэнд каледжа, — дадае намеснік дырэктара Алена Кананкова. — Падчас усяго навучальнага года ў вольны ад заняткаў час навучэнцы фасуюць чайныя напіткі. Акрамя таго, нашы рабяты вывучаюць старадаўнія рэцэпты падрыхтоўкі адвараў і страў, у склад якіх уваходзяць расліны, што вырошчваюцца ў гадавальніку. Вывучаюць дзеці і нацыянальныя беларускія традыцыі, звычаі па выкарыстанні лекавых, чайных і вострых культур для ўмацавання здароўя, не толькі вучацца гатаваць напіткі з іх, але і праводзяць дэгустацыі на раённых святах.

КЛАСЫ БЕЗ СЦЕН

У гэтай установе адукацыі Жлобіншчыны ёсць добры вопыт ажыццяўлення цэлых праектаў у раслінай сферы. Напрыклад, студэнцкі атрад «Дняпроўскія зоры» некалькі гадоў таму на пляцоўцы ў два гектары вырошчваў і збіраў кветкі календулы. Члены атрада сабралі каля трох тон раслінай сыравіны. Уся вырашчаная прадукцыя была рэалізавана. Па выніках работы гэтага сельскагаспадарчага атрада каледж стаў пераможцам абласнога конкурсу «Працоўны семестр» у намінацыі «Найлепшы наймальнік». У 2013—2014 гадах у навучальнай гаспадарцы на двух гектарах вырошчвалі кмен. Такая ідэя ўзнікла пасля вывучэння патрэбнасці ў кмене прадпрыемстваў харчовай прамысловасці вобласці. Сельскагаспадарчы атрад навучэнцаў на працягу двух гадоў займаўся вырошчваннем двухгадовай культуры.

— Для гэтага вывучылі вопыт яе вырошчвання ў Беларусі, звярнуліся па кансультацыі да спецыялістаў. У выніку атрымалі прамысловы ўраджай — звыш дзвюх тон кмену. Спецыялісты правялі лабараторныя даследаванні яго якасці, і, згодна з вынікамі аналізу, вырашчаная намі прадукцыя мела больш высокія якасныя характарыстыкі, чым імпартныя аналагі, якія закупляліся. Кмен, вырашчаны ў нашым каледжы, поўнасцю задаволіў патрэбнасць хлебазаводаў Гомельскай вобласці ў гэтай прыправе. Досвед вырошчвання кмену ў нашым каледжы быў прадэманстраваны ў адным з выпускаў інфармацыйнай праграмы на канале Агульнанацыянальнага тэлебачання, — падзялілася Алена Кананкова.

Па словах педагога, вырошчванне кмену дазволіла навучэнцам паглыбіць веды пра агратэхніку вырошчвання двухгадовых раслін, навучыцца выконваць практычныя работы — падрыхтоўваць і апрацоўваць глебу, навучыла разлікам нормы высеву насення, унясення ўгнаенняў, падкорму і сродкаў аховы раслін.

— Асабліва важна, што навучэнцы на практыцы пераканаліся: ва ўмовах Беларусі можна займацца вырошчваннем не толькі традыцыйных сельскагаспадарчых культур. На прыкладзе вырошчвання кмену яны атрымалі досвед ўвасаблення ў жыццё ініцыятывы, звязаной з іх далейшай прафесійнай дзейнасцю, — пераканаўча намеснік дырэктара ўстановы адукацыі. — Наш педагагічны калектыў мэтанакіравана працуе над стварэннем умоў для развіцця ў навучэнцаў ініцыятывы і творчага падыходу, заахвочвання да сацыяльна значнай дзейнасці. Для гэтага выкарыстоўваюцца ўсе існуючыя магчымасці і, у прыватнасці, навучальная гаспадарка, гадавальнік. У каледжы ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Таму важна сарыентаваць актыўнасць нашых выпускнікоў менавіта на гэту галіну эканомікі, навучыць іх бачыць перспектывы сваёй будучай прафесіі.

З 2012 года ў каледжы ўвасабляюць у жыццё маладзёжны праект «У зямлі — наша сіла, у зямлі — нашы карані». Лекавыя расліны ў гадавальніку пры неабходнасці вырошчваюць практычна ў прамысловых маштабах. Штогод аб'ём нарыхтаванай прадукцыі ў гадавальніку складае каля 600 кілаграмаў сыравіны ў сухім выглядзе. Вырашчаныя зёлкі пастаўляюцца фармацэўтычным прадпрыемствам. Ураджай траў штогод даследуецца на адпаведнасць санітарным нормам супрацоўнікамі Жлобінскага раённага Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

ПАРАДЫ АД МОЛАДЗІ

Цікава, што сёння навучэнцы каледжа ўжо гатовыя кансультаваць жыхароў Жлобіна і раёна па пытаннях агратэхнікі вырошчвання раслін, доглядзе за пасадачным матэрыялам. Валанцёрскія групы з ліку навучэнцаў каледжа на працягу некалькіх гадоў актыўна займаліся закладкай гадавальнікаў у навучальных установах і экалагічных цэнтрах Жлобінскага, Хойніцкага і Кармянскага раёнаў.

Сёння гадавальнік Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа — адзін з любімых аб'ектаў наведвання для гасцей райцэнтра. У каледжы не так даўно пабывала дэлегацыя Рэспублікі Зімбабвэ. Дарэчы, візіт прадстаўнікоў дэпартамента сельскагаспадарчай адукацыі Міністэрства земляў, сельскай гаспадаркі, рыбалоўства, водных рэсурсаў і развіцця сельскіх раёнаў Рэспублікі Зімбабвэ — крок у адказ на прапанову Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аб стварэнні агульных інвестыцыйных і кааперацыйных праектаў паміж нашымі краінамі. У дадзеным кірунку асаблівы акцэнт — на дамоўленасці па падрыхтоўцы спецыялістаў, у тым ліку навучанні іх прафесіям сельскагаспадарчага профілю ў беларускіх установах адукацыі. Між тым, вопыт навучэнцаў і педагогаў Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа па вырошчванні лекавых, чайных і вострых культур выклікаў асаблівую цікавасць у гасцей з Афрыкі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Жлобінскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа.

ВЕЧНЫ ВАНДРОЎНІК

«ДЗЯДЗЬКА НАСТАЎНІК»

У Германавічах ёсць музей імя Язэпа Драздовіча. Мы абавязкова завітаем туды ў канцы экскурсіі. А пакуль сядаем у машыну (многія турысты робяць гэта пешкі ці на роварах) і едзем у Сталіцу. Не, не ў Мінск. Сталіцай называецца невялічкая вёска пад Германавічамі. Ёсць меркаванне, што гэтае месца так назвалі, бо яно было роўнае, як стол. Паводле іншай версіі, тут нібыта хацелі заснаваць школу і адправілі «сто ліц», каб тыя папрасілі аб гэтым ва ўлад.

Беларускамоўная школа ў Сталіцы, дарэчы, з'явілася. Арганізаваў яе ў 1921 годзе Язэп Драздовіч. Месцілася яна ў простай сялянскай хаце. Ды праіснавала не больш як тры месяцы. Польскія ўлады закрылі яе як «нелегальную». «Бедавалі бацькі, плакалі дзеці», — згадвае мастак у сваім дзённіку. Бо «вучняў ён вучыў па сваёй методыцы без «пастрах і кары», а на разуменні, што ёсць дабро, а што зло, што прыгожае, а што — непрыгожае. Слухалі яго і паважалі не як «господина учителя» ці «пана», а як свайго «дзядзьку настаўніка». Землякі і вяскоўцы звалі яго проста «дзядзька Язэп», — піша ў сваім рукапісе беларускі мастак Алесь Марачкін. Хата, у якой месцілася школа, на жаль, не захавалася, на малюнку мастака можна ўбачыць толькі месца, дзе яна стаяла.

«СТАРАВАТЫ ВЫ ДЛЯ МЯНЕ»

Наступны прыпынак — вёска Ляскова. Менавіта там у 1936 годзе была створана карціна Язэпа Драздовіча, якая так і называецца — «Ляскова». Лічыцца, што гэта самае радаснае палатно мастака, таму што яно было асветлена каханнем.

На карціне намалявана сядзіба Восіпа Балошкі, у якой вельмі часта гасцяваў Язэп Драздовіч. У гэтай сям'і было шасцёра дзяцей. У адну з дачок, якой на той момант было каля 20 гадоў, мастак закахаўся. І нават прапанаваў дзяўчыне стаць яго жонкай, але тая яму адмовіла, сказала: «Стараваты вы для мяне...» Язэпу Драздовічу на той момант было пад 50. Ён, дарэчы, не пакрыўдзіўся, бо разумеў, што не мае ні кала, ні двара, таму па сутнасці яму няма куды прывесці нявесту. «Спачатку мы думалі, што мастак закахаўся ў малодшую дачку Надзею, бо захаваўся яе партрэт, — кажа навуковы супрацоўнік і экскурсавод мастацка-этнаграфічнага музея імя Язэпа Драздовіча Іна Пучынская. — Але кропкі над «і» расставіў адзін з унукаў Восіпа Балошкі, які працуе ў філіяле Акадэміі навук у Гродне. Ён даслаў нам артыкул, дзе напісана, што менавіта яго маці Ганна Балошка была той дзяўчынай, у якую закахаўся Язэп Драздовіч». Карціна «Ляскова» разам з іншымі работамі мастака доўгі час упрыгожвала сцены хаты Балошкаў. Ім тое падабалася, усім казалі: «У нас, як у музеі».

Дарэчы, існуе меркаванне, што на карціне «Ляскова» першапачаткова было намалявана пяць чалавек, але калі Язэп Драздовіч паказаў чарнавік Ганне, яна сказала: «Крэпка шмат людзей». І ён замаляваў дзве выявы. Цяпер карціна «Ляскова» знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навуковы супрацоўнік і экскурсавод мастацка-этнаграфічнага музея імя Язэпа Драздовіча, стараста аграгарадка Германавічы Іна ПУЧЫНСКАЯ каля банера ў Лужках.

музея. Копія ёсць у Германавічах. І ад яе сапраўды зыходзіць неверагоднае святло, ад якога на душы робіцца цяплей.

«ЯК ТОЛЬКІ ПАЧАЛІСЯ КАНІКУЛЫ, ЗАБЫЎСЯ НА СВАЮ КАРОВУ»

І вось мы спыняемся каля банера ў Лужках. Іна Сямёнаўна распавядае, што ў 1939 годзе мастака запрасілі працаваць настаўнікам малявання і астраноміі ў мясцовую школу. Сельсавет выдзеліў яму хату і карову. Здавалася б, ёсць дах над галавой, работа, якую добра ведаў і да якой імкнуўся. Можна было асесці, ажаніцца... Але душа мастака патрабавала падарожжаў. Таму як толькі пачаліся школьныя канікулы, ён забыўся на сваю карову, пакінуў хату і пайшоў вандраваць. Як ён пісаў пра гэта: «Хаджу, малюю, радзіме даўгі аддаю». «На сёння, калі хтосьці з экскурсантаў

На магіле маці Язэпа Драздовіча ў Германавічах дагэтуль ляжыць камень з выгравіраваным па эскізе сына надпісам.

пачынае шкадаваць Язэпа Драздовіча, казаць, што жыццё яго не ўдалося, я не пагаджаюся. Яшчэ невядома, чыё жыццё ўдалося: наша з гаспадаркамі, з пастаяннай фізічнай працай, ці яго, з кіламетрамі нязведаных дарог і прыгод? Я лічу, мастака задавальняў такі лад жыцця, інакш ён бы скарыстаў момант і асеў у Лужках, ажаніўся. Тым больш што мужчына ён быў спрытны, не абдзелены жаночай увагай». Тым не менш, часам ноткі смутку прысутнічалі, бо ў адным з вершаў ён піша: *«Я па свеце хаджу / Ды чужыя куты ўкрашаю. / Я і свой бы куток разукрасіў, / Ды на жаль, свайго куту не маю».*

ПРЫВАЛ НА БЕРАЗЕ МНЮЦІЦЫ

«Хаджу паміж Мнютай і Аутай і малюю людзям», — пісаў Язэп Драздовіч. Таму сімвалічна, што наступны наш прыпынак у Жуках Ложных, на беразе Мнюты. Язэп Драздовіч вельмі любіў тую раку, называў яе памяншальна-ласкальна Мнюціцай. Непадалёк ад гэтага месца знаходзілася хата Янцэвічаў, дзе падабалася бываць Язэпу Драздовічу. Дарэчы, выява згаданага хутара ёсць на дыване ў германавіцкім музеі. «У сям'і Янцэвічаў было дзевяць дзяцей, найбольш Язэп сябраваў з малодшай Амілечкай. Хоць яна была і не надта прыгожай, твар яе быў пабіты воспай, але яны знайшлі адно аднаго. Ён спачуваў дзяўчынцы, а яна яму. Дзяўчына мыла Язэпу Драздовічу бялізну. А ён, у сваю чаргу, намаляваў яе партрэт у валошкавым вяночку, які, на жаль, не захаваўся да нашага часу. У Амілечкі быў складаны лёс: маці памерла, калі яна была маленькая. І жаночы клопат пра бацьку і братоў лёг на кволыя дзявочыя плечы. Амілечка ўсіх абшывала, абмывала. Язэп Драздовіч часта паўтараў: «Будзеш ты шчаслівая за тое, што душа ў цябе такая добрая і адкрытая». Але тут ён не ўгадаў. Пасля вайны дзяўчына нейкім чынам апынулася ў Канадзе, працавала ў кафэ пасудамыйкай, а потым аслепла і дажывала свой век у адзіноце».

ПЕРАЖЫВАЎ, ШТО НЕ ЗМОЖА ЎСТАНАВІЦЬ НА МАГІЛЕ МАЦІ ГОДНЫ ПОМНІК

І вось мы вяртаемся ў Германавічы ды рушым на каталіцкія могілкі, дзе пахавана маці мастака. Яна займала значнае месца ў жыцці Язэпа Драздовіча. Настолькі, што калі захварэла, ён, не раздумваючы, кінуў работу настаўнікам малявання ў мінскай гімназіі, каб быць побач з ёй. Памерла Юзэфа Драздовіч ва ўзросце 80 гадоў. Мастак вельмі перажываў, што з-за беднасці не зможа ўстанавіць на магіле маці годны помнік. А таксама вельмі шкадаваў, што не напісаў пры жыцці яе партрэт.

«Надмагільная пліта па маці зроблена на заказ па эскізе самога Язэпа Драздовіча, — расказвае і паказвае дырэктар музея Людміла Навіцкая. — Менавіта па гэтым надпісе на камені (зачытвае) «Juzefa 1841—1921 Narcyzava Drazdovic» у 1990-х гадах і ўдалося знайсці тую магілку».

Юзэфа Драздовіч ведала на памяць шмат беларускіх казак, баек, легендаў і незлічоную колькасць народных прыказак. У яе рана памёр муж, і жанчына засталася адна з шасцю дзецьмі на руках, самы меншы сярод якіх — Язэп. Менавіта маці адкрыла яму дарогу ў дзіўны свет мастацтва і, нягледзячы на беднасць, дапамагла атрымаць адукацыю. «Жанчына бачыла, што змалку Язэп быў крышачку іншы, чым усе астатнія дзеці. Ён не цікавіўся сельскагаспадарчай працай, а ў сваіх мроях ды летуценнях нешта выразаў з дрэва, маляваў». Старэйшыя сыны мелі свае сем'і, арандавалі зямлю. Яны былі прымацаваныя да нейкага месца. Таму за іх маці не надта хвалявалася. Яе найбольш непакоіў у сэрцы самы малодшы. «Дзе прытуліцца ён, якая доля яго чакае? Ад зямлі ён зусім адбіўся, а што здабыў сваім талентам? Любы шавец ці кравец мае пэўны кавалак хлеба, сталае месца ў жыцці, а ў

Юным наведвальнікам музея прапаноўваюць скласці пазл з выявамі маляванак Язэпа Драздовіча.

яго ні хлеба, ні страхі над галавой. Ці асмеліцца хто пайсці за беспрытульніка? Так адзінокі і звякуе». Выходзіць, маці прадбачыла адзінокае жыццё сына да скону...

«МЯНЕ ЯШЧЭ ПАШУКАЮЦЬ...»

Жыццё Язэпа Драздовіча было цесна звязанае з Германавічамі. Таму сімвалічна, што менавіта тут знаходзіцца не толькі вуліца, але і мастацка-этнаграфічны музей яго імя. Там, у былым палацы Шырынаў, і завяршылася наша пазнавальная вандроўка. У зале, прысвечанай творчасці Язэпа Драздовіча, адразу ж кінулася ў вочы скульптура «Вечны вандроўнік», якую я не раз бачыла ў Траецкім прадмесці ў Мінску. Толька там помнік адліты з бронзы. А ў Германавічах — копія з сілуміну. Зрабіў яго адмыслова для германавіцкага музея беларускі скульптар Ігар Голубеў. «Ён прыязджаў да нас, калі святкаваў сваё 60-годдзе. Сябры яму арганізавалі паездку па мясцінах, дзе знаходзяцца яго творы. Дык казаў, што працаваў з дзённікамі Язэпа Драздовіча, якія знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы. І прачытаў там, што Язэп піша: «і яшчэ ў цэнтры Мінска мне будзе стаяць помнік». Гэтае прароцтва, як і вядомае «мяне яшчэ пашукаюць», споўнілася.

Вельмі шмат зрабіла для адраджэння памяці пра славутага земляка жыхарка Германавіч Ада Райчонак. 30 гадоў таму яна яшчэ працавала настаўніцай, запрагала каня і разам са сваімі вучнямі ездзіла па вёсках. Хадзілі па хатах, шукалі — можа, дзе што засталося з яго спадчыны. Паколькі ў Язэпа Драздовіча не было пастаяннага месца жыхарства, ён маляваў там, дзе гасціў, іншымі словамі, «працаваў за гасціннасць». Таму практычна ў кожнай хаце пакінуў штосьці пасля сябе. Карціны, малюнкі алоўкам, знакамітыя выданы-маляванкі. Каб крышачку раней, вядома, можна было б больш сабраць. Бо многія з тых дываноў, якія калісьці ўпрыгожвалі сцены дамоў, ужо былі пушчаны ў гаспадарку, хтосьці паслаў іх на падлогу».

У германавіцкім музеі каля сарака экспанатаў, звязаных з Язэпам Драздовічам. Сярод іх сшытак з рукапісам мастака, тры арыгінальныя кіі (ён, дарэчы, быў выдатным разьбяром). Ёсць дываны-маляванкі, якія пакуль не выстаўляюцца, бо патрабуюць рэстаўрацыі. Не так даўно супрацоўнікі музея знайшлі ў адной з закінутых хат у вёсцы Ляскова вышыўку з макаткі Язэпа Драздовіча (макаткі — невялічкія работы, якімі ўпрыгожвалі сцены). Тым, хто хоча паглядзець больш дываноў, раяць завітаць у Музей маляванкі, што адкрыўся ў Заслаўі. Акрамя таго, чатыры арыгінальныя работы Драздовіча захоўваюцца ў Падсвільскай школе. Сярод іх дыван-маляванка «Зачараваны замак», пазначаны годам смерці мастака. Старшы супрацоўнік музея Таццяна Катовіч параіла таксама пачытаць кнігу «Вечны вандроўнік», дзе Арсен Ліс апісаў жыццё і дзейнасць славутага мастака. І распавяла, што вельмі цікава чытаць дзённікі Язэпа Драздовіча. «Не з першага разу зразумееш тое, што ён хацеў сказаць. Мы ўжо па пяць разоў іх перачыталі і яшчэ хочацца, бо ён усё вельмі цікава апісваў. Такое адчуванне, што пісаў не для сябе, а для людзей. Як быццам ведаў, што мы будзем чытаць яго запісы».

У канцы экскурсіі Іна Пучынская дастала аркуш з правіламі, якімі кіраваўся ў жыцці Язэп Драздовіч. «Нашы экскурсанты з задавальненнем іх фатаграфуюць, — усміхаецца Іна Сямёнаўна. — А я радуюся. Бо з кожным годам усё шырэй і шырэй распаўсюджваецца мудрасць народнага мастака».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
фота аўтара.
Шаркаўшчынскі раён.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

ПРЫВІТАННЕ, ПЛОСКАСТУПНЁВАСЦЬ

Які абутак шкодны?

«Выклікае праблемы са здароўем» — менавіта такі надпіс неабходна размяшчаць на некаторых кардонках з абуткам, гэтак жа, як робяць папярэджанні на пачках цыгарэт. Расказваем, як нас калечаць угі, в'етнамкі і вузканосыя лодачкі.

На шпільках

Шпількі — біч мноства жанчын. Не заклікаем адмовіцца ад іх, але важна запомніць дзве аксіёмы. Першая: высокія абцасы — гэта абутак «на выхад», а не для «дэфіле» па асфальце на работу. Другая: нельга насіць абцас вышэй за 6 см на пастаяннай аснове.

Калі чалавек стаіць роўна, нагрузка на суставы і органы размяркоўваецца нармальна. Пры пад'ёме на абцасы цэнтр цяжару ссоўваецца наперад. Каб захаваць баланс, цела вымушанае мяняць становішча касцей, органаў і пазванкоў. Пры сталым нашэнні высокіх абцасаў усе гэтыя змены атрымліваюць статус хранічных.

Глабальныя наступствы такіх змен — папярочная плоскаступнёвасць, мазалі, болі ў нагах, варыкознае расшырэнне вен.

Што рабіць, калі абутак на абцасе — частка дрэс-коду? Захоўвайце пад офіснym сталом мяккія тапкі і пры любой магчымасці пераабувайцеся, даючы нагам адпачынак.

На плоскай падэшве (шлёпанцы, в'етнамкі, угі)

Для шлёпанцаў і в'етнамак таксама ёсць свае месца і час — пляж, басейн, аквапарк, лазня. Надзелі на 10 хвілін, каб дайсці ад мора да атэля, знялі і забыліся. Не больш за тое.

Чаму неабходна выконваць такое правіла? Пры носцы шлёпанцаў чалавек увесь час злёгку згінае пальцы, каб утрымліваць абутак на нагах. Так узнікае перанапружанне мышцаў ступні, затым яно пераходзіць вышэй — на галёнкі, паясніцу, сцёгны, нават шыю. З-за гэтага да канца дня можа з'явіцца галаўны боль ці боль у спіне. Прадукты абмену назапашваюцца ў мышцах галёнкі, выклікаючы балючыя адчуванні.

Насіце сандалі, басаножкі, у якіх раменьчыкі шчыльна ўтрымліваюць пятку і насок. Тое ж патрабаванне

распаўсюджваецца і на зімовы абутак тыпу угі. Падэшва павінна быць мяккай і гнуткай, а нага не павінна «боўтацца». Абутак на плоскім хаду не дае неабходнай апоры, таму шпацыраваць у ім па асфальце шкодна.

Таксама вазьміце сабе за правіла мяняць зімовы абутак. У вас павінна быць некалькі пар, каб іх можна было чаргаваць. Так ступня будзе працаваць з рознай нагрузкай, і пераход на вясновыя і летнія мадэлі не адаб'ецца на арганізме, ногі не будуць балець, адчуваючы дыскамфорт ад рэзкай змены ўмоў.

Артапедычны

Шмат каму здаецца, што нашэнне артапедычнага абутку ці артапедычных вусцілак карыснае для апорна-рухальнага апарату, што гэта дапаможа выправіць скаліёз ці плоскаступнёвасць. Некаторыя бацькі спецыяльна купляюць сваім дзецям менавіта такія туфлі і чаравікі, каб з ранняга ўзросту прадухіліць развіццё гэтых захворванняў.

Насамрэч артапедычны абутак не лечыць плоскаступнёвасць ці скаліёз, бо першапрычына падобных праблем не ліквідуецца толькі з дапамогай вусцілак. Прычына — родавая траўма, наступствы якой можна прыбраць толькі шляхам лячэння. Больш за тое, шмат што будзе залежаць ад узросту пацыента і іншых спадарожных нюансаў, таму насіць артапедычны абутак проста так няма ніякага сэнсу, акрамя выключна рэдкіх выпадкаў.

На памер меншы

Распродаж, апошні памер, «любоў з першага погляду» — гэтыя прычыны прымушаюць жанчын купляць абутак на памер або паўпамеру меншы. Яшчэ ёсць асобная катэгорыя абутку — «у іх зручна сядзець»: дзяўчаты купляюць жаданыя туфлі, у якіх, вядома, можна хадзіць па гладкай падлозе крамы, але для рэальнага жыцця яны аказваюцца непрыдатнымі.

Калі вы ўсё ж перасільваеце сябе і носіце нешта падобнае, будзьце асцярожныя: гэта адмоўна адбіваецца на здароўі і стане апорна-рухальнага апарату.

Вядома, бываюць сітуацыі, калі мы купляем абутак на памер меншы выпадкова. Каб выключыць гэта, па-першае, набывайце абутак толькі пасля прымеркі (памятайце пра тое, афармляючы заказы ў інтэрнэт-крамах!). Па-другое, рабіце куплю ў пэўны час сутак: увечары, калі ногі крыху ацякаюць пасля працоўнага дня. Так вы цалкам не пралічыцеся з памерам. Калі прымераць і купіць абутак у першай палове дня, вельмі верагодна, што надзець гэтую пару туфляў увечары будзе праблематычна. Калі ж вы зможаце ў іх улезці, хутчэй за ўсё, будзеце адчуваць, што туфлі моцна ціснуць.

Занадта вузкі

Абутак з вузкім носам, цесны, які візуальна памяншае аб'ём ступні, — гэта прыгожа вонкава. Але наступствы яго нашэння сумныя: касцяныя нарасты, хранічны дыскамфорт, перацісканне ступні. Усяму гэтаму спадарожнічае дрэннае самаадчуванне, болевыя адчуванні, раздражняльнасць. Вам тое патрэбна?

Галоўнае правіла, якога неабходна прытрымлівацца пры выбары абутку, — адчуванне камфорту, зручнасць. Ступня не павінна пакутаваць. Абцас? Добра, але невысокі, устойлівы. Матэрыялы — натуральныя. Нельга закупорваць ступні, пераціскаць...

На шчасце, паняцце прыгажосці і прывабнасці ў наш час не суадносіцца з памерам ступні, як, напрыклад, у Старажытным Кітаі. Таму сачыце за тым, каб абутак быў камфортны і якасны, бо гэта непасрэдна ўплывае на здароўе, наяўнасць або адсутнасць шэрагу праблем і захворванняў і, як вынік, на працаздольнасць і якасць жыцця.

Бывайце здаровы

РЭЖЫМ ДНЯ

Ці ёсць карысць ад жыцця па строгім графіку?

Навукоўцы даўно даказалі: працуючы і выбудоўваючы жыццё ў адпаведнасці з біялагічнымі рытмамі, можна стаць значна больш прадукцыйнымі, паспяховымі, здаровымі і проста шчаслівымі. Што ж з'яўляецца найбольш важным складнікам правільнага рэжыму дня? Да чаго вядзе нерацыянальны распарадак працы і адпачынку? Што адбываецца з арганізмам пры рабоце ў начныя змены і як нівеліраваць гэтыя наступствы?

Як вядома, наша здароўе на 20 % вызначаюць гены, на 20 % — навакольнае асяроддзе, яшчэ 10 % фарміруе ўзровень медыцынскага абслугоўвання, а астатнія 50 % — наш спосаб жыцця. І адзін з яго складнікаў — правільна сфарміраваны распарадак дня, які супадае з біярытмамі канкрэтнага чалавека.

— Паслядоўнае чаргаванне працы і актыўнага адпачынку, рэгулярны прыём ежы, пэўны час абуджэння і сну, своечасовае выкананне шэрагу гігіенічных працэдур дазваляюць падтрымліваць належны ўзровень працаздольнасці працяглы час, — расказвае **практыкант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ЛАПО.** — Немалаважным для здароўя таксама з'яўляецца ўзровень псіхалагічнага камфорту.

У сучасных умовах прытрымлівацца здаровага спосабу жыцця і рэжыму дня асабліва важна, што абумоўлена ростам нагрузак на чалавека. Гэта звязана як з ускладненнем нашага жыцця, павелічэннем рызык тэхнагеннага, экалагічнага, псіхалагічнага характару, так і з ўмовамі харчавання, якія істотна змяніліся, гіпадынаміяй, хранічным стрэсам. У сукупнасці ўсё гэта правакуе негатыўныя змены для здароўя. Свядомае стаўленне да сябе дапамагае нівеліраваць такія рызыкі.

Што ж з'яўляецца важнымі кампанентамі рэжыму дня і якія наступствы яго парушэння?

Здаровы сон

Паўнавартасны штодзённы сон — найважнейшая ўмова нармальнага функцыянавання арганізма, нашага здароўя і добрага самаадчування. У норме сон дарослага чалавека павінен доўжыцца 6-8 гадзін, але, калі рэжым збіваецца, арганізм не паспявае адпачыць і аднавіцца. Недастатковы сон пагаршае якасць памяці і скарачае здольнасць канцэнтравацца, што можа правакаваць памылкі ў рабоце і паводзінах. Пры моцнай стомленасці і недасыпанні назіраецца павышаная ўразлівасць імуніцтэту, зніжэнне кагнітыўных функцый, раздражняльнасць і выразнае пагаршэнне вонкавага выгляду.

Правільнае харчаванне

Тут варта памятаць аб выкананні двух асноўных законаў. Першы — раўнавага энергіі, якую мы атрымліваем і выдаткоўваем. Калі арганізм атрымлівае энергіі больш, чым расходуе, гэта значыць калі мы ўжываем ежы больш, чым тое неабходна для падтрымання працэсаў жыццядзейнасці, працы і добрага самаадчування, апошняе прыводзіць да лішняй вагі, а таксама цэлага шэрагу хвароб: атэрасклерозу, ішэмічнай хваробы сэрца, гіпертаніі, цукровага дыябету і шмат чаго іншага.

Другі закон — адпаведнасць хімічнага складу нашага рацыёну фізіялагічным патрэбам арганізма. Харчаванне павінна быць разнастайным і забяспечваць неабходную колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, вітамінаў, мінеральных рэчываў, харчовых валокнаў. Многія з гэтых рэчываў незаменныя, паколькі не ўтвараюцца ў арганізме, а паступаюць толькі з ежай.

Размеркаванне колькасці ежы і набор страў залежаць ад узросту, характару работы, а таксама ад таго, у які час сутак вы працуеце.

Рэжым працы і адпачынку

Нерацыянальны рэжым працы і адпачынку прыводзіць да таго, што мы губляем час, прадукцыйнасць нашай дзейнасці змяншаецца, асабліва ў другой палове дня і ў канцы змены, мы можам нават атрымаць хваробы, выкліканыя стомленасцю, ці вытворчую траўму.

Зменны рэжым працы і начныя змены, безумоўна, негатыўна адбіваюцца на здароўі. Пры рабоце ў начныя змены арганізм адчувае перагрузку, траціць назапашаныя рэзервы. У першую чаргу нагрузка кладзецца на нервовую і эндакрынную сістэмы, адбіваецца на псіхаэмацыянальным статусе. Рана ці позна арганізм дасць збой абвастрэннем хранічных ці з'яўленнем новых захворванняў. Чалавек не ў сілах перабудаваць сутачныя біярытмы пад свае патрэбы. Толькі правільна арганізаваўшы рэжым харчавання, актыўнасці і сну, можна знізіць наступствы «жыцця наадварот».

Пры такой рабоце неабходна адказна паставіцца да захавання рэжыму харчавання і выбару прадуктаў у начны час, паспрабаваць піць дастаткова вадкасці, не злоўжываць кафеінам, мець дастатковa рухальнай актыўнасці, а таксама паўнавартасна высыпацца. Калі б ні пачыналася ваша работа, добры сон — залог плённага працоўнага дня.

Многія, хто ўстанавіў для сябе распарадак і спрабаваў яго выконваць, заўважалі, што паспяваюць зрабіць за дзень значна больш, чым звычайна. Пры гэтым высыпаюцца, нармальна харчуюцца і не маюць праблем са здароўем, паколькі ахоўныя сілы арганізма істотна павялічваюцца.

Наша здароўе мае патрэбу ў падтрымцы кожны дзень, бо арганізм працуе без выхадных і свят. Таму сістэмнасць у выкананні прынцыпаў здаровага спосабу жыцця — добрая дапамога для захавання здароўя на доўгія гады.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
19 ліпеня 2023 г. № 25 (711)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЖЫВЫ ЎДЗЕЛ

Сёння, 19 ліпеня, у Брэсцкай вобласці беларускія сенатары на чале са старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ праводзяць адзіны дзень прыёму грамадзян. Парламентарыі ўважліва выслухаюць усіх жадаючых у кожным райвыканкаме рэгіёна і Баранавіцкім гарвыканкаме. Спікер разгледзіць звароты ў Ганцавіцкім раённым выканаўчым камітэце. Агучаныя праблемы будуць узятыя на кантроль, а гэта значыць — там, дзе іх магчыма вырашыць, яны будуць вырашаныя. Так адбывалася і падчас ранейшых зваротаў грамадзян да парламентарыяў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Гісторыю аднаго з іх расказвае наш уласны карэспандэнт у Магілёве.

Фота БелТА.

Валянціна ЮЗАФОВІЧ трымае ў руках загад аб прыёме на працу сваёй хрэсніцы.

Маргарыта ЗАРЭЦКАЯ на месцы працы, якая ёй па душы.

Магіляўчанка Валянціна Юзафовіч звярнулася непасрэдна да спікера верхняй палаты парламента Наталлі Качанавай, каб дапамагчы сваёй хрэсніцы з Гомеля Маргарыце Зарэцкай знайсці працу. Справа ў тым, што ў Маргарыты праблема са слыхам. Яна скончыла мінскі каледж, атрымала прэстыжную спецыяльнасць, але на этапе размеркавання ўзніклі складанасці. Зварот да старшыні Савета Рэспублікі быў апошняй надзеяй на станоўчы вынік. Праблема вырашылася менш чым за месяц.

Складанасці са слыхам у Маргарыты з нараджэння. У Гомелі яна вучылася ў спецыялізаванай школе для дзяцей з парушэннямі слыху, паралельна развівала свае мастацкія здольнасці. Пасля 10-га класа падала дакументы ў Мінскі дзяржаўны каледж лічбавых тэхналогій, які паспяхова скончыла сёлета. Атрымала не адну, а дзве спецыяльнасці — аператар ЭВМ і тэхнік-праграміст камп'ютарнай графікі. Сёння такія спецыялісты запатрабаваныя. Вось толькі з размеркаваннем атрымалася сапраўдная бяда.

— У каледжы прапанавалі спачатку месца касіра ў «сеткавіка», хоць незразумела, навошта было амаль шэсць гадоў вучыцца, каб ісці туды працаваць, — дзеліцца Валянціна. — Другі варыянт — праграміст у сярэдняй школе — таксама не падышоў. У Маргарыты чацвёртая ступень глухаты, як ёй працаваць са здаровымі дзецьмі? Ды яны ж здзекавацца з яе пачнуць. Яшчэ ёй параілі ісці на спецыялізаванае прадпрыемства, але не па спецыяльнасці. Маргарыта вучылася на бюджэце. Хочаш не хочаш, а адпрацоўваць трэба. Яна ўжо амаль змірылася з тым, што прыйдзецца ісці на некваліфікаваную работу, але тут падключылася я. Які сэнс працаваць толькі дзеля мінскай прапіскі і ложка ў інтэрнаце? Нават зарплата там крыху больш за 500 рублёў. Чамусьці размеркаванне завязанае толькі на Мінску, быццам бы такія спецыялісты не патрэбныя ў іншых абласцях. Бацькі хрэсніцы шукалі ёй работу ў Гомелі, але самі нічога знайсці не змаглі. Ды і разгубіліся.

Суразмоўніца лічыць, што каледж з размеркаваннем крыху не дапрацоўвае. Спецыялісты накшталт Маргарыты маглі б нядрэнна працаваць на «аддаленцы», абслугоўваць, напрыклад, сайты, напаўняць іх інфармацыяй, прасоўваць тавары ці паслугі. І каледж тут павінен быць зацікаўлены ў папулярызацыі сваіх спецыялістаў. Што датычыцца падрыхтоўкі, то яна грунтоўная. «І каледж цудоўны, і выкладчыкі спрэс прафесіяналы», — кажа яна.

У звароце да кіраўніка Савета Рэспублікі Валянціна Юзафовіч у роспачы падзялілася і сямейнай бядой. Маргарыта, як высветлілася, не толькі яе хрэсніца, але яшчэ і родная пляменніца. Старэйшы брат дзяўчыны таксама глухі. І гэта прытым, што іх бацькі цалкам здаровыя людзі і ў родзе ні ў кога не было такой асаблівасці. Розніца паміж братам і сястрой — пяць гадоў. Бацькі, калі чакалі дзяўчынку, былі перакананыя, што з ёй будзе ўсё добра. Але ў немаўляці аказаўся той жа дыягназ.

— Вядома, што ён не смяротны, але мы стараемся не нагадваць дзецям пра тое, што яны асаблівыя, — кажа жанчына. — Яны мелі ўсе магчымасці паўнавартасна развівацца. У школе наведвалі гурткі, спортам займаліся. Абое цудоўна малююць. Наогул, усё пры іх, толькі слых адсутнічае. У хлопца лёс склаўся больш удала. Працуе і жыве ў Мінску, ёсць сям'я. Але дзяўчыне з такім дыягназам значна цяжэй.

Маргарыта спрабавала працаўладкавацца ў фірму, дзе яна спадзявалася рэалізавацца. Патэнцыяльнага работадаўцу ўсё задавальняла, акрамя аднаго. Дзяўчына дрэнна яго чуе і ўвесь час перапытвае. Просьба хроснай размаўляць з Маргарытай павольна, выразна і не адварочваючыся ў бок яго толькі раззлавала. «Вы нам не падыходзіце», — коратка заключыў ён і вярнуў дакументы.

Да Наталлі Качанавай Валянціна Юзафовіч звярнулася, калі прачытала ў інтэрнэце, што яна вельмі чула ставіцца да праблем грамадзян і шмат каму дапамагла. Адказ не прымусіў сябе доўга чакаць.

— Мой зварот зарэгістравалі ў Савеце Рэспублікі 26 красавіка, а 18 мая ўжо патэлефанавалі з Гомеля і запрасілі на сустрэчу, — кажа Валянціна. — Мы размаўлялі з начальнікам упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Генадзем Вамбрыкавым. Нас уважліва выслухалі, паглядзелі Маргарыціны дыплом і работы і прапанавалі некалькі варыянтаў працаўладкавання. І самы цікавы — фабрыка мастацкіх вырабаў «Любна», дзе была вакансія дызайнера эксперыментальнай лабараторыі. Дырэктарам там на той момант быў Сяргей Барысенка, і ён аціаніў веды Маргарыты вельмі станоўча. Яму спадабалася тое, што яна хутка справілася з яго заданнем. Дзяўчына вельмі рада, што знайшла работу. У яе абавязкі ўваходзіць распрацоўка ўзораў малюнкаў, якія наносяцца на сувенірную прадукцыю, стварэнне лічбавых каталогаў гатовых вырабаў, прасоўванне сайта фабрыкі. Яна адчувае сябе ў сваёй стыхіі і гатовая сваёй працай прыносіць карысць дзяржаве.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара
і з архіва Валянціны ЮЗАФОВІЧ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Умовы для росту

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала вёску Чудзенічы Лагойскага раёна. У цэнтры — азнаямленне з інфраструктурай, работа сацыяльных аб'ектаў і, вядома ж, зносіны з мясцовым насельніцтвам аб жыцці ў вёсцы, паведамляе карэспандэнт БелТА.

Наталля Качанава, у прыватнасці, наведала Чудзеніцкі дзіцячы садок Лагойскага раёна, пагутарыла з кіраўніцтвам, педагогамі і работнікамі сталовай дзіцячай дашкольнай установы.

Наступны прыпынак Старшыні Савета Рэспублікі — Чудзеніцкі фельчарска-акушэрскі пункт Лагойскага раёна. Спікер паразмаўляла з жыхарамі населенага пункта. Пытанняў зададзена шмат — забеспячэнне вадой, транспартная інфраструктура, добраўпарадкаванне тэрыторыі, стварэнне рабочых месцаў.

Наталля Качанава азнаёмілася з культурнай інфраструктурай вёскі. Акрамя таго, яна высветліла, як ідуць справы з наяўнасцю і цэнамі на прадукты харчавання для мясцовых жыхароў. Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на недастатковы асартыментны пералік тавараў у мясцовай краме. «Гэта не інспекцыя, а азнаямленне з сітуацыяй, якая складваецца ў рэгіёнах, у прыватнасці, у такіх вёсках. VI Усебеларускі народны сход адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі вызначыў моцныя рэгіёны. Прэзідэнт ставіць задачу аб раўнамерным развіцці ўсіх тэрыторый краіны. І вось тут, недалёка ад горада Мінска, у вёсцы, якая расце, дзе людзі купляюць зямлю з аўкцыёну, то-бок вёска прырастае, а значыць, павінны быць адпаведныя ўмовы для жыцця», — расказала Наталля Качанава.

Як адзначыла спікер, у цэлым тут людзі нармальна жывуць, працуюць, але пытанні ёсць. «Напрыклад, з водазабеспячэннем, рамонтам жылфонду, асартыментам у магазіне, чаго не павінна быць, бо прадпрыемствы выпускаюць такую прадукцыю. Мы думаем, як яе паставіць на экспарт, зрабіць запатрабаванай, а не можам напоўніць нашы магазіны для сваіх людзей. Безумоўна, тое дрэнна. Не павінны людзі з гэтай вёскі ездзіць па прадукты і тавары ў Лагойск ці Мінск. Вядома, асартымент павінен быць дастойны. Транспартныя зносіны: людзі павінны мець магчымасць даехаць зручна і своечасова туды, куды лічаць патрэбным, тым больш што многія працуюць у Лагойску і Мінску. Таму ўсе пытанні мы абавязкова возьмем на кантроль, абмяркуем іх з мясцовымі органамі ўлады. Я думаю, яны будуць вырашаны ў хуткім часе», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Службовыя асобы не маюць права стаяць у баку ад праблем, якія хвалююць людзей, канстатавала Наталля Качанава. Дэпутаты мясцовага ўзроўню таксама павінны больш актыўна працаваць з насельніцтвам. «Мы бачылі, што людзі ў доме рамантуюць усё самі, збіраюцца, робяць рэнавацыю дома, рамантуюць пад'езды. Ім трэба крыху дапамагчы, і, вядома, будзе зусім іншая сітуацыя. І людзі застануцца задаволеныя, і не давядзецца ім пісаць у розныя інстанцыі ці чакаць, каб нехта прыехаў, убачыў і звярнуў увагу на праблемы, якія ў іх ёсць», — рэзюмавала спікер.

Асаблівая ўвага — эканоміцы

Ігар ГЕДЗІЧ сустрэўся з членамі групы дружбы з Беларуссю ў Народнай скупшчыне Рэспублікі Сербія.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, член рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Сербія Ігар Гедзіч узяў удзел у сустрэчы з членамі групы дружбы з Беларуссю ў вышэйшым заканадаўчым і канстытуцыйным органе Сербіі на чале з яе кіраўніком Драгамірам Карычам у фармаце відэаканферэнцсувязі.

У ходзе сустрэчы адбыўся прадукцыйны абмен думкамі па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня. Бакі абмеркавалі дынаміку палітычных адносін на еўрапейскай прасторы.

У кантэксце двухбаковага ўзаемадзеяння асаблівая ўвага была ўдзелена перспектывам развіцця эканамічнага супрацоўніцтва і павелічэнню тавараабароту паміж Беларуссю і Сербіяй.

Адкрыццё варкаўт-пляцоўкі ў Каменцы.

ЗВАРОТ І ВЫНІК

Прамыя тэлефонныя лініі, асабістыя прыёмы грамадзян — фармат работы, які не толькі дазваляе вырашыць канкрэтную праблему асобнага чалавека, калектыву альбо жыхароў пэўнай мясцовасці. Нярэдка агучаныя пытанні — магчымасць удасканаліць заканадаўчую базу. Да таго ж такія кантакты паказваюць, чым жывуць людзі, што іх хвалюе.

Пелішчанская аптэка

Напрыклад, жыхары вёскі Пелішча Камянецкага раёна напісалі калектыўны зварот у Савет Рэспублікі, каб не дапусціць закрыцця аптэкі ў сваім населеным пункце.

— Наша аптэка нерэнтабельная, таму яе хацелі закрыць, маўляў, работнікі амбулаторыі самі будуць прадаваць лекі, — расказала жыхарка населенага пункта Людміла Аляксіна. —Людзям тое не спадабалася, бо аптэка зручна размешчана ў будынку амбулаторыі, у ёй ёсць усё неабходнае, калі якія-небудзь лекі адсутнічаюць, работнік аптэкі заўсёды заказвае іх. Пасля калектыўнага звароту ў верхнюю палату парламента ў вёсцы быў прызначаны сход з удзелам прадстаўнікоў улады. Нас выслухалі, зразумелі, і аптэку пакінулі. Я вельмі рада, што ўлады палічыліся з меркаваннем жыхароў. Гэта вельмі важна — нас, простых людзей, пачулі.

Белавежскі газ

Больш за два месяцы жыхары шматкватэрнага дома ў аграгарадку Белавежскі заставаліся без газу.

— Яшчэ ў канцы красавіка пачаўся капітальны рамонт нашага шматпавярховага дома, — падзялілася Іна Васілеўская. — Нам далі на рукі дагаворы, дзе было прапісана, у якія тэрміны павінен завяршыцца рамонт. Была абвестка, што на працягу месяца газ будзе адсутнічаць. Праходзіць месяц, потым пяты, шосты тыдзень, а газу ў доме ўсё няма. Звярталася ў «Брэстгаз», там сказалі, што ўсё гатова для падключэння, чакаем указанняў ЖКГ. Тады патэлефанавала ў Камянецкую ЖКГ, але там нічога толкам не сказалі. Я папярэдзіла, што мы, жыхары дома, будзем скардзіцца далей. Праходзіць сёмы тыдзень... Даведалася,

Варкаўт-пляцоўка на месцы вялікай лужыны ў горадзе Каменец.

ПА ТЭРЫТОРЫІ І ЖАДАННІ

У Беларусі расце попыт на ваенна-патрыятычныя лагеры

У 2021—2022-м у Беларусі было каля 480 ваенна-патрыятычных лагераў, сёлета — ужо 583. У іх адпачывае амаль шэсць тысяч дзяцей. У 23 буйных ваенна-патрыятычных клубах пры воінскіх часцях і на «Лініі Сталіна» створаны лагеры. Цікавасць да патрыятычнага адпачынку дзяцей у бацькоў вельмі высокая, а вось змясціць усіх жадаючых сілавыя структуры пакуль не ў стане, таму, пэўна, улады будуць праглядаць сістэму падыходу да арганізацыі лагераў згаданага тыпу. Да такой высновы прыйшлі падчас прыёму ў межах Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, які праводзіла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці Ірына СТАРАВОЙТАВА. Наведвальнікі звярталіся з прапановамі па ўдасканаленні ваенна-патрыятычнага выхавання дзяцей і работы адпаведных установ, асабліва ў летні перыяд, а таксама іншымі тэмамі, датычнымі выхавання.

«Вяршэнства закона і справядлівасць»

Камісія, па сутнасці, акумулюе рашэнні, прынятыя адносна патрыятычнага выхавання, занятасці дзяцей падчас летняга адпачынку, ажыццяўляе міжведамаснае ўзаемадзеянне, растлумачыла Ірына Старавойтава.

— Да нас звяртаюцца бацькі, дзеці, іх законныя прадстаўнікі. Мы разглядаем пытанні, якія датычацца сацыяльнага дабрабыту дзяцей у сем'ях, захавання іх правоў і інтарэсаў. Да кожнага пытання падыходзім вельмі ўважліва, бо любы зварот — гэта жыццё і лёс дзіцяці, дабрабыт у сям'і. Гэта і маніторынг практыкі прымянення нарматыўных заканадаўчых актаў. У далейшым пры прапрацоўцы законаў мы разумеем, дзе неабходная карэкціроўка.

Прадстаўнікі камісіі ёсць у кожнай вобласці, да іх могуць звярнуцца бацькі і дзеці і вырашыць любыя пытанні. Часта звароты патрабуюць пэўнага часу і прапрацоўкі. Яны вырашаюцца ва ўзаемадзеянні з дзяржорганамі.

Мы робім запыт, аналізуем перапіску, заканадаўчыя акты, аднак у рашэннях заўжды два асноўныя прынцыпы — вяршэнства закона і справядлівасць, — дадала сенатар.

Рыхтуйся да адпачынку з зімы

Кацярына ПАЎЛЮЧЭНКАВА з Заслаўя, якая прыйшла на прыём, кажа, што сутыкнулася з праблемай адправіць сына ў ваенна-патрыятычны лагер на «Лініі Сталіна». Трапіць у яго можна па дзяржаўнай датацыі тым, хто тэрытарыяльна адносіцца да гэтай мясцовасці. Жанчына адмовілася ад датацыі, заплаціла поўны кошт і дамаглася, каб яе сын адпачыў менавіта там. Яна прапануе даць такую магчымасць усім жадаючым.

— Датацыі трэба даваць тым, хто мае ў іх патрэбу. А тыя, хто хоча і можа аддаць дзіця ў лагер, павінны мець такую магчымасць, — перакананая яна. *— Такія лагеры вельмі патрэбныя нам сёння, асабліва хлопчыкам.*

Мой васьмігадовы сын ужо хоча ў армію. У лагеры ён «сходзіць у армію», паносіць пілотку, пахваліцца потым сябрам.

Брэстчына: канкрэтныя справы

што ў мясцовую школу прыязджае наш сенатар. Мы з суседкай паехалі да яго на прыём. Ён выслухаў і паабяцаў, што вырашыць праблему. Прайшло двое сутак пасля размовы — і газ з'явіўся!

Камянецкая лужына

Трэцяя гісторыя пачалася яшчэ ў 2020 годзе, калі на прамую тэлефонную лінію сенатара звярнуліся жыхары Паўднёва-Заходняга мікрараёна горада Каменца — людзі жадалі пазбавіцца ад вялікай лужыны на сваёй тэрыторыі.

— Сенатар разам з дырэктарам Камянецкай ЖКГ наведаў праблемны аб'ект, — згадвае жыхарка мікрараёна Лізавета Басалай. — Да таго часу мясцовымі гаспадарамі ўжо прымаліся меры па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Западзіну засыпалі будаўнічым смеццем. Але эфект людзей не задавальняў. Мы напісалі калектыўны зварот і прапанавалі выканкаму пабудаваць на гэтым месцы спартыўную пляцоўку. Для мяне як маладзёжнага лідара было важна, што аб'ект накіраваны на прапаганду здаровага способу жыцця. Праект падрыхтавала ЖКГ. З адабрэння выканкама і пры ўдзеле ДРБУ-137 лужыну ператварылі ў сучасную варкаўт-пляцоўку. З моманту яе адкрыцця прайшло ўжо два гады, і не было ніводнага вечара, каб яна пуставала. Дзякуючы сенатару ў моладзі з'явіўся новы аб'ект прыцягнення.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

РАЎНАПРАЎНЫ РУХ НАСУСТРАЧ

Дамоўленасці X Форуму рэгіёнаў да многага абавязваюць

Дзясяты, юбілейны Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, што праходзіў у чэрвені ў расійскай Уфе, ужо стаў спраўджанай гісторыяй. Добрай, пазітыўнай гісторыяй з яшчэ больш умацаванымі сувязямі, з мільённымі падпісанымі новымі кантрактамі. Пачалася падрыхтоўка да новага форуму, які налета прыме наш Віцебск.

Важнае мерапрыемства ў рамках Саюзнай дзяржавы (пакуль у рамках — у відэавароце да ўдзельнікаў форуму ва Уфе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў пашырыць геаграфію ўдзельнікаў) кожны раз праводзіцца пад патранатам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі. Сенатары заўсёды ў складзе аргкамітэта, выступаюць мадэратарамі тэматычных секцый, прысутнічаюць на перагаворах дэлегацый рэгіёнаў. Мы прапанавалі некаторым членам Савета Рэспублікі вярнуцца ў думках на некалькі тыдняў назад і падзяліцца вынікамі і ўражаннямі ад форуму. Яно зусім не позна: работа па выніках толькі пачынаецца, падпісаныя кантракты і дамоўленасці будуць рэалізоўвацца не адзін дзень.

Алег ДЗЯЧЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі:

— Падчас работы X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў кангрэс-холе «Таратау» ва Уфе мы падпісалі пагадненне з Інстытутам развіцця адукацыі Рэспублікі Башкартастан аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве ў сферы бесперапыннай педагагічнай адукацыі і адукацыі дарослых. Дарэчы, дакумент падпісаны ў рамках рэалізацыі выніковага рашэння леташняга Форуму рэгіёнаў у частцы пашырэння супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, маладзёжнай палітыкі паміж установамі дадатковай адукацыі Беларусі і арганізацыямі дадатковай прафесійнай адукацыі Расіі.

Сёння дадзеная тэма асабліва актуальная. І вось чаму. У сучасных умовах бесперапынная адукацыя ці, як цяпер кажуць, «адукацыя праз усё жыццё», мае ў прафесійнай сацыялізацыі ледзь не самае галоўнае значэнне. Калі праграмы бакалаўрыята і магістратуры ставяць за сваю мэту ў першую чаргу падрыхтоўку спецыялістаў з адпаведнымі базавымі прафесійнымі кампетэнцыямі, то паслядыпломная адукацыя арыентавана на далейшае паэтапнае паглыбленне ў прафесію на аснове перадавога практычнага вопыту, асіміляцыю новых дасягненняў навуковага, педагагічнага, культурнага і інавацыйнага падыходаў у прафесійнай дзейнасці.

Разам з калегамі з башкірскага Інстытута развіцця адукацыі мы плануем абменьвацца эфектыўным вопытам удасканалення бесперапыннай педагагічнай адукацыі і дадатковай адукацыі дарослых, рэалізоўваць сумесныя адукацыйныя праграмы і праекты, арганізоўваць і праводзіць навукова-метадычныя мерапрыемствы, у тым ліку ў дыстанцыйнай форме, а таксама ўзаемадзейнічаць па іншых напрамках адукацыйнай і навуковай дзейнасці. Нам ёсць што прапанаваць расіянам у сферы грамадзянска-патрыятычнага выхавання, захавання гісторыка-культурнай спадчыны, інклюзіўнай адукацыі, духоўна-маральнага выхавання. У сваю чаргу, мы паглядзім, які досвед работы башкірскіх педагогаў можна запазычыць для апрабацыі і ўкаранення ў айчынную практыку. Пачатак узаемавыгаднага супрацоўніцтва пакладзены. Асноўныя напрамкі сумеснай дзейнасці вызначаны. Будзем працаваць на вынік.

Аляксей НЯВЕРАЎ, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар прадпрыемства «Гомельаблпрам»:

— З году ў год форум набіраў абароты, пашыраючы гарызонты супрацоўніцтва двух брацкіх народаў у самых розных сферах. Юбілейны X Форум, мяркуючы па ўсім, паб'е ўсе рэкорды па колькасці заключаных кантрактаў. Агульная сума — каля 1,5 мільярда долараў. І гэта толькі папярэдняя лічба.

На тры дні сталіца Башкартастана Уфа стала цэнтрам прыцягнення прадстаўнікоў дзелавых колаў абедзвюх краін. Свае самыя лепшыя праекты і дасягненні рэгіёны прадэманстравалі ў рамках шматлікіх выставак. Нікога не пакінула абыякавай ВДНГ у мініяцюры. Ва ўсіх сэнсах магутнай атрымалася экспазіцыя машынабудавання Беларусі. Сярод экспанатаў — найноўшыя ўзоры МАЗ, БелАЗ, МТЗ, «Гомсельмаш». Многія з машын дэманструюць сабой выдатны прыклад паспяховай кааперацыі і імпартазамяшчэння. Галоўнае, што нашай тэхнікі становіцца ўсё больш у Расіі, у тым ліку ў самых аддаленых яе кутках.

Таксама запомнілася адкрыццё магазіна на вуліцы Камуністычнай — першага ў Башкірыі, дзе прадстаўлены тавары толькі беларускай вытворчасці. А таксама фірменнай крамы гомельскага прадпрыемства «Камінтэрн». У нашага вытворцы дзелавога адзення, безумоўна, вялікая будучыня на расійскім рынку.

Уразіў, вядома, не толькі эканамічны блок. Фестываль нацыянальных культур «Вуліца Дружбы», які расцягнуўся на паўтара кіламетра ва Уфе, аб'яднаў традыцыі рэгіёнаў у самых яркіх, душэўных вобразах. Падворкі пакарылі гасцей свята ўрачыстасцю колеру, смаку і формы. Ва ўсёй красе паўсталі на фестывалі нашы спрадвечныя беларускія рамёствы: разьба па дрэве, саломапляценне, ганчарства. Не забудзе Уфа і самы вялікі карагод «кола ў крузе», які сабраў больш за 3000 чалавек і занесены ў Кнігу рэкордаў Расіі.

Цяпер трэба ажыццяўляць пазначаныя планы, рэалізоўваць дасягнутыя дамоўленасці.

Юрый НАРКЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— Дэлегацыя Брэсцкай вобласці вельмі прадукцыйна з'ездзіла ва Уфу для ўдзелу ў мерапрыемствах X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

У рамках форуму было падпісана сем пагадненняў аб супрацоўніцтве органаў кіравання і самакіравання Брэсцкай вобласці і рэгіёнаў Расіі, а таксама дыстанцыйна падчас правядзення мерапрыемстваў форуму былі падпісаны кантракты паміж прамысловымі прадпрыемствамі Брэстчыны і прадпрыемствамі Смаленска, Казані, Уфы.

У складзе афіцыйнай дэлегацыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі бізнесу Брэсцкай вобласці, якія правялі сустрэчы з зацікаўленымі прадстаўнікамі бізнесу Расійскай Федэрацыі на прадмет развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Па выніках перагавораў падпісаны пратакол аб намерах паміж нашым ААТ «Бярозабудматэрыялы» і Спецыялізаваным гандлёвым домам ва Уфе па пытаннях арганізацыі экспартных паставак беларускай керамічнай плітак.

Намеры развіваць супрацоўніцтва ўзніклі і па выніках перагавораў паміж кіраўніцтвам Даманаўскага вытворча-гандлёвага камбіната і Салавацкага каталізатарнага завода на прадмет экспартных паставак беларускага сілікату натрыю. Даманаўскі камбінат ужо адправіў узоры прадукцыі на адрас расійскага контрагента для правядзення неабходных лабараторных выпрабаванняў, па выніках якіх будзе вызначаны фармат далейшага супрацоўніцтва.

Брэсцкай вобласці паступіла прапанова заключыць пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж Уфімскім раёнам Рэспублікі Башкартастан і адным з раёнаў Брэсцкай вобласці. Прапрацоўка дадзенага пытання ўжо пачата. Цяпер ідзе падборка аптымальных варыянтаў з нашага боку з уліцам геаграфічнага становішча, колькасці насельніцтва, эканамічнага і культурнага патэнцыялу расійскага рэгіёна.

Сяргей АНЮХОЎСКІ, член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар САА «Камунарка»:

— Удзел у X, юбілейным, Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў горадзе Уфа ў поўнай меры даў магчымасць пазначыць пазіцыю палітыкаў, грамадскіх дзеячаў і шматлікіх экспертаў абедзвюх краін: мы разам, мы адзіныя, наш курс на раўнапраўны рух насустрач адзін аднаму з'яўляецца непарушным. Сустрэчы, зносіны, выпрацоўка адзінай пазіцыі па ўсіх ключавых кірунках развіцця ў палітыцы, эканоміцы, сацыяльным жыцці, дэманстрацыя адзінства — галоўныя дасягненні нашай работы.

Мы паглядзелі адно аднаму ў вочы, сустрэліся, каб прагаварыць галоўнае, адчуць настрой і выказаць цёплую падтрымку. А таксама зразумець, што сёння як ніколі раней нашы адзінства і ўзаемадзеянне прыносяць плён у выглядзе сотні пагадненняў аб супрацоўніцтве і кантрактаў на агульную суму каля 110 млрд расійскіх рублёў.

Старэйшае пакаленне людзей, што выросла ў часы Савецкага Саюза, памятае адзінства вялікай краіны, разумее трагедыю раз'яднанасці, якая ўразіла славян сёння. Нам не трэба тлумачыць гістарычныя карані нашых народаў і важнасць падтрымкі адно аднаго. Але наша моладзь выросла ў іншы час, таму спецыяльна для іх ствараюцца маладзёжныя праекты: «Цягнік Памяці», прафарыентацыйная школа «За бяспеку!». Гэта вельмі важна — аб'ядноўваць нашых дзяцей, ствараць умовы для сяброўства і ўзаемадзеяння, тады яны будуць расці, усведамляючы, што побач з імі сябры, і пасля тое сяброўства прынясе свой плён. Цяпер мы падаём ім прыклад, як правільна дзейнічаць, а потым ужо яны, калі вырастуць, змогуць пазбегнуць памылак, ім ніхто не ўваб'е ў галаву думкі аб адсутнасці агульнасці і не настроіць адзін супраць аднаго. Гэта што да нашай работы ў эканамічным і агульначалавечым планах.

Важна падкрэсліць і палітыка-інстытуцыянальныя зрухі: статус Форуму ў рамках Саюзнай дзяржавы будзе істотна павышаны. Многія гады мы працуем поплеч з расійскімі партнёрамі, ажыццяўляючы наша ўзаемадзеянне на прынцыпах роўнасці, павагі суверэнітэту, захавання нацыянальных інтарэсаў, падтрымкі адзін аднаго і паступальнага руху наперад.

Колькасць ваенна-патрыятычных лагераў павялічваецца, і налета іх будзе яшчэ больш, запэўніла **Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ, кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Мінадукацыі:**

— Аб'ёмы бюджэтных датацый на аздараўленчую кампанію ў Беларусі фарміруюцца на пэўную тэрытарыяльную адзінку і па колькасці жадаючых дзяцей. Бацькі пачынаюць звяртацца да нас у студзені. На падставе гэтага ў сакавіку пачынае камплектавацца база для аздараўлення. Лагеры фарміруюцца з колькасці навучэнцаў, калі гэта, напрыклад, школа. І калі дзеці вучацца ў Мінску, а хочуць у лагер у Заслаўі, то на іх не будзе распаўсюджвацца датацыя, і адпачыць там яны змогуць толькі за поўны кошт. Пэўная катэгорыя дзяцей (сіроты, інваліды) адпачывае ў лагеры са 100-працэнтнай датацыяй (бясплатна). Для іншых дзяцей, бацькі і законныя прадстаўнікі якіх працуюць і адлічваюць сродкі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, прадугледжана частковая аплата путёўкі.

Каб дзіця трапіла ў ваенна-патрыятычны лагер, бацькам варта загадзя звяртацца з дадзеным пытаннем ва ўпраўленне па адукацыі або тэрытарыяльныя структуры рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні, параіла спецыяліст.

— Дзеці не дзеляцца па тэрытарыяльнай прыкмеце адносна таго, ці патрэбнае ім аздараўленне. Аднак спосабы фінансавання адпачынку прывязаныя да тэрытарыяльнай прыкметы, — заўважыла Ірына Старавойтава. — Бацькам той катэгорыі, якая хоча, каб іх дзеці адпачылі ў лагеры незалежна ад месца пражывання, пэўна, трэба даць магчымасць зрабіць гэта за поўны кошт. Адпаведна, варта павялічыць колькасць месцаў у лагеры, скажам, да 25 чалавек, з якіх чацвёра могуць паехаць за поўны кошт па жаданні бацькоў. Аднак пытанне па датацыях яшчэ патрабуе абмеркавання і прапрацоўкі.

Практыка прымянення нормы, якая датычыцца стварэння ваенна-патрыятычных лагераў і бюджэтнага фінансавання, абсалютна новая. З арганізацыяй лагера на «Лініі Сталіна» і вялікага попыту на знаходжанне ў ім узнікла патрэба ў норме, якая садзейнічала б магчымасці адпачыць там тым дзецям, якія не вучацца ў школьных установах, што тэрытарыяльна належаць да гэтага лагера.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

СВОЙ СЯРОД СВАІХ

ЖЫВЕ ТАКІ ХЛОПЕЦ...

Малады дэпутат і галоўны аграном — пра будні і святы з пункту гледжання вяскоўца

У вёску Малыя Славені збіралася з іншай нагоды, але выпадкова пазнаёмілася з Русланам Краўцовым. Калі шукала ў інтэрнэце каардынаты Славенскага сельсавета, знайшла нумар яго мабільнага тэлефона. Чалавек, зразумела, адказны, не перажывае, што могуць турбаваць і не ў рабочы час. Так яно і аказалася. І гэта прытым, што ён не толькі намеснік старшыні Славенскага сельсавета, але яшчэ і галоўны аграном ЗАТ «Вялікія Славені» Шклоўскага раёна. Нягледзячы на малады ўзрост, ён ужо мае добры і прафесійны, і дэпутацкі, і нават сямейны вопыт.

Парламентарый з Малых Славеняў

Руслан — адзін з тых дзесяці маладых людзей з Магілёўскай вобласці, якія ўвайшлі ў 2020 годзе ў першы склад Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Ад Шклоўскага раёна вылучалася шмат кандыдатур, але выбралі менавіта яго. Перспектыўны, пры пасадзе, актывіст. Тады Руслан Краўцоў ужо быў галоўным аграномам. Лічыць, што той вопыт, які ён атрымаў, быў для яго вельмі каштоўным.

— На нашых сесіях у Мінску ўзнімаліся розныя тэмы, у тым ліку палітычныя, — успамінае Руслан. — 2020-ы быў складаны год ва ўсіх адносінах. Абмяркоўвалі маладзёжныя пытанні, як растлумачыць аднагодкам тыя падзеі, што адбываюцца ў свеце. У парламенце размаўлялі наконт таго, як моладзь можа развіваць свае лідарскія якасці, а ўжо тут, на месцы, разам з работамі вырашалі, якія ідэі хацелася б рэалізаваць. Была магчымасць данесці мясцовыя ініцыятывы і прапановы да самага высокага ўзроўню. Спачатку я прагаварваў ідэю старшыні нашай камісіі, а ўжо потым яна агучвалася на сесіі. На іх заўсёды прысутнічала кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента Наталля Качанава.

У аграпрадпрыемстве, дзе працуе Руслан, моладзі дастаткова, лічы, чвэрць працоўнага калектыву. Дарэчы, ЗАТ «Вялікія Славені» — адна з найбольш перспектыўных гаспадарак, якая ўваходзіць у агрохалдынг «Купалаўскае». Яе назва размешчана на абласной Дошцы гонару па выніках сацыяльна-эканамічнай дзейнасці за мінулы год. У Шклоўскім раёне таварыства ў тройцы лідараў па ўраджайнасці: у 2021-м займала трэцяе месца, летась — другое. Адпаведныя месцы прысуджваліся і галоўным аграномам гаспадарак, у тым ліку Руслану Краўцову. У маштабах краіны гаспадарка мае сярэднія па памерах сельгасугоддзі — больш за пяць тысяч гектараў.

— Асноўным відам дзейнасці таварыства з'яўляецца жывёлагадоўля з развітым раслінаводствам, — удакладняе суразмоўнік. — Пагалоўе жывёлы — 7 тысяч. Клапоцімся, каб у нашага статка быў паўнавартасны рацыён. Вырошчваем рапс, пшаніцу, трыцікале, ячмень. Гэты год паказаў, што азімы ячмень лепш ад яравога. Апошні вельмі моцна пацярпеў ад засухі. А вось азімы сябе цудоўна паказаў. Магчыма, налета трэба зрабіць акцэнт менавіта на яго. Да таго ж убіраць апошні зручней. Яравы косім практычна адначасова з іншымі культурамі, а вось з азімым лягчэй размеркаваць уборку.

Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся

Малая радзіма Руслана — менавіта аграгарадок Малыя Славені. Тут ён нарадзіўся, скончыў сярэднюю школу ў суседнім Забродцы, паступіў у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, дыплом якой атрымаў восем гадоў таму.

— Кіраўнік гаспадаркі прапанаваў мне ісці вучыцца ў акадэмію ў Горкі і вяртацца сюды на работу, — расказвае малады чалавек. — Я пагадзіўся і слова сваё трымаю. І нават планаў на тое, каб з'ехаць адсюль, не раблю. Мяне ўсё задавальняе.

На зарплату і сацыяльныя выгоды малады чалавек не скардзіцца, падкрэслівае, што ўсім неабходным тутэйшыя спецыялісты забяспечваюцца. Калі жаніўся, кіраўнік гаспадаркі адразу ж уручыў ключы ад кватэры. Потым, калі вызваліўся катэдж, маладыя пераехалі туды. Жонка ў Руслана, дарэчы, магіляўчанка. «На жаль, пакуль ездзіць у Магілёў на работу, — заклапочаны ён. — Але не выключана, што ў будучыні што-небудзь перспектыўнае і для яе знойдзецца ў аграгарадку».

— А як вольны час праводзіце? — цікаўлюся.

— А гэта што такое? — суразмоўнік робіць здзіўлены выгляд, даючы зразумець, што такога амаль няма.

Калі сур'ёзна, то для мясцовай моладзі, асабліва калі ёсць свой транспарт, з месцамі для правядзення вольнага часу праблем няма.

